

# «КАЛІ БУДЗЕМ АКТЫЎНІЧАЦЬ, МЫ ПЕРААДОЛЕЕМ УСЕ СКЛАДАНАСЦІ І ЦЯЖКАСЦІ»

**На сустрэчы Прэзідэнта з губернатарам Валагодскай вобласці адкрыліся вялікія перспектывы пашырэння супрацоўніцтва**

(Стар. 2–3)

РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ
ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
26 ЖНІЎНЯ 2025 г. АЎТОРАК № 163 (30551)



# ПЕРШЫ КРОК У САМАСТОЙНАСЦЬ



## Паглядзелі, як першакурснікі БДУІР у інтэрнат засяляюцца

Учора дзверы інтэрната № 4 Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі адчыніліся для навaспечаных студэнтаў. Гэты корпус каторы раз становіцца месцам прапіскі для тых, хто толькі-толькі робіць першыя крокі ў дарослае жыццё. На засяленні нядаўніх абітурыентаў у інтэрнат пабывалі карэспандэнты «Звязды».

СТАР. 8–9

ЦІ МАГЧЫМА АДНАЎЛЕННЕ ДЫЯЛОГУ МАСКВЫ І ВАШЫНГТОНА? 7



Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ЖНІВО-2025

# СЛУЖБА НА ХЛЕБНАЙ НІВЕ

**Як супрацоўнікі ўнутраных спраў дапамагаюць аграрыям**

Тое, што ўборка ўраджаю — справа агульная, можна сказаць, нацыянальная, беларусы не раз пацвярджалі. Ва ўсе часы самыя адказныя і складаныя задачы вырашаюцца талакою. Жніво — не выключэнне. Нават у стагоддзе энерганасычанай тэхнікі дапамога не бывае лішняй, тым больш што надвор'е аграрыяў рэгулярна выпрабоўвае. Каб убраць ураджай своечасова і без страт, хлебаробам дапамагаюць прадстаўнікі розных прафесій. Многія нават ахвяруюць доўгачаканым адпачынкам і нікольки аб гэтым не шкадуюць, бо на коне — харчовая бяспека краіны.

СТАР. 4–5



Першы экіпаж-тысячнік сярод міліцыянераў у складзе Дзмітрыя РАМАНАВА і Алега БОГДАНА.

ISSN 1990 — 763X
25163>

# «КАЛІ БУДЗЕМ АКТЫЎНІЧАЦЬ, УСЕ СКЛАДАНАСЦІ

## На сустрэчы Прэзідэнта з губернатарам Валагодскай вобласці адкрыліся

**Новы рабочы тыдзень у Палацы Незалежнасці пачаўся сустрэчай з гасцямі з рэгіёна, які знаёмы не толькі знаўцам геаграфіі, але і аматарам творчасці легендарных «Песняроў». Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з дэлегацыяй Валагодскай вобласці на чале з губернатарам Георгіем Філімонавым.**



Фота БелТА.

Сустрэчу беларускі лідар пачаў успамінам пра тую самую знакамітую песню — «Волагда». Як адзначыў Аляксандр Лукашэнка, у тым ліку і дзякуючы расійска-беларускаму калектыву «Песняры», Валагодская вобласць стала самай вядомай і блізкай для Беларусі. Ён згадаў, як падчас буйнага нацыяналізму ў Беларусі, які квітнеў у краіне некалькі гадоў да выбрання Прэзідэнта, спрабавалі прымусіць грамадства адмовіцца ад усяго рускага.

«Але грамадства не ўспрыняла гэты пасыл. І мне давялося часта бываць у «Песняроў» у першы-другі год свайго прэзідэнцтва ў іх падвальным памяшканні, дзе яны рэпеціравалі. І я памятаю, як Валодзя Мулявін мяне вельмі папрасіў дапамагчы вярнуцца на сцэну. Вядома, мы зрабілі ўсё для таго, каб «Песняры» вярнуліся. І вялікая песня, якую вельмі цэняць, ведаю, у вас у горадзе, у вобласці, вельмі любімая і ў нас. Уся Расія і Беларусь ведаюць і любяць творчасць «Песняроў», у тым ліку і гэтую, здавалася б, простую, але цяпер вялікую песню. Сапраўды, усё вялікае ў простым, у тым, што разумеюць і любяць людзі», — адзначыў Прэзідэнт.

### «МЫ АД АДНАГО КОРАНЯ АДБЫЛІСЯ»

Георгій Філімонаў, губернатар Валагодскай вобласці, у Беларусі першы раз. Аляксандр Лукашэнка назваў гэта вялікім недаглядам. «Ну як: побач, родныя людзі — і першы раз у нас тут? Але я думаю, што гэта толькі пачатак, і вы, бываючы ў Маскве ці дзесьці бліжэй да нас, заўсёды знойдзеце час для таго, каб наведаць Беларусь. Ну, і лішні раз не толькі нагадаць пра вялікую Валагодчыну і пра сябе (гэта таксама важна), але і прарэвізаваць, як выконваюцца тыя дамоўленасці, якіх мы дасягнём. Павінен вам сказаць, што з нашага боку праблем быць не павінна», — запэўніў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка назваў галоўную мэту, якую ставіць, сустракаючыся з кіраўнікамі расійскіх рэгіёнаў. Па-першае, гэта падзяка губернатарам за тое супрацоўніцтва, якое мы сёння маем. «Не было б вас — не было б і гэтага супрацоўніцтва. Асабліва ў былыя часы, не такія простыя і радасныя ў нашых адносінах, як цяпер, — адзначыў ён. — Праблемны час аб'ядноўвае людзей».

Па-другое, для Беларусі вельмі важна супрацоўніцтва з расійскімі рэгіёнамі. «Гэта, напэўна, самыя-самыя рускія рэгіёны Цэнтральнай Расіі. Вялікая павага нашага народа да рускага народа. Мы адзін народ фактычна. Ад аднаго кораня адбыліся і нарадзіліся, мы падобныя адзін да аднаго абсалютна, і ў нас прынцыпы адны і тыя ж,

## Даслоўна

### «МЫ МАЕМ МЭТУ ДАСЯГНУЦЬ МІЛЬЯРДА ДОЛАРАЎ ТАВАРААБАРОТУ ДА 2030 ГОДА»



**Журналістам Георгій Філімонаў раскрыў падрабязнасці сустрэчы з беларускім лідарам і расказаў, якія планы ў Валагодскай вобласці на супрацоўніцтва з нашай краінай. Паводле слоў губернатара, Беларусь цяпер займае першае месца ў знешнегандлёвым абароце Валагодскай вобласці, яе доля складае каля 20 %. «Гэта яшчэ не мяжа, у нас ёсць нераскрыты патэнцыял, і мы імкнёмся да ўдасканалення нашага партнёрства, раскрыцця патэнцыялу нашых гандлёва-эканамічных адносін», — адзначыў ён. Георгій Філімонаў звярнуў увагу, што дні Валагодскай вобласці, якія прайшлі ў Мінску ў мінулыя выхадныя, былі прысвечаны таму, каб глыбей раскрыць гандлёва-эканамічны, інвестыцыйны, турыстычны, культурна-гуманітарны патэнцыялы рэгіёна для беларусаў.**

Па выніках мінулага года аб'ём экспарту валагодскіх тавараў у Беларусь склаў суму 450 мільёнаў долараў. Расце і імпарт беларускіх тавараў у Валагодскую вобласць — летась ён склаў 316 мільёнаў долараў. «Мы маем намер пашыраць усю лінейку ўзаемных паставак з мэтай дасягнуць паказчыка ў мільярд долараў двухбаковага тавараабароту ўжо да 2030 года», — падзяліўся планамі Георгій Філімонаў. І расказаў аб планах, рэалізацыя якіх прывядзе да дасягнення мэты.

«У першую чаргу, гэта магчымасць будаўніцтва мультымадальнага, шматбрэндавага сэрвіснага цэнтра на тэрыторыі Валагодскай вобласці, які будзе абслугоўваць усю тэхніку беларускай вытворчасці. Сёння ў Валагодскай вобласці эксплуатуецца больш за шэсць тысяч адзінак беларускай тэхнікі. Мы прапанавалі разгледзець магчымасць размяшчэння такога аб'екта на тэрыторыі асаблівай эканамічнай зоны «Ляскова», якая запушчана ў гэтым годзе пры падтрымцы Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі. Мы прапануем цэлы шэраг падатковых ільгот рэзідэнтам гэтай асаблівай эканамічнай зоны», — адзначыў губернатар Валагодскай вобласці.

Другі вялікі праект — сумесная вытворчасць беларускай тэхнікі на тэрыторыі Валагодскай вобласці. Спачатку гэта можа быць зборка, затым — вытворчасць запчастак з лакалізацыяй да 70 % і з наступным выхадам на вытворчасць поўнай кампанентнай базы для таго, каб беларускую спецыяльную тэхніку кампаніі «Пажзаб» можна было выпрабляць на тэрыторыі Валагодскай вобласці. «Летась Валагодская вобласць набыла 17 адзінак пажарных аўтацыстэрнаў вытворчасці кампаніі «Пажзаб». Мы цэнім якасць гэтага беларускага вытворцы, яна адпавядае сучасным патрабаванням. Мы ахвотна выкарыстоўваем гэтую тэхніку, і яна эфектыўна сябе паказала на тушэнні пажараў. Дарэчы, Валагодская вобласць займае другое месца па закупках гэтай пажарнай тэхнікі, на першым месцы — Санкт-Пецярбург. І мы хочам разгарнуць сумесную вытворчасць кампаніі «Пажзаб» у нас у вобласці, каб пастаўляць на рынак Расіі гэту спецыялізаваную тэхніку», — падзяліўся Георгій Філімонаў.

Паводле слоў губернатара, у Валагодскай вобласці напрацаваны цэлы шэраг партнёрскіх трэкаў па ўзмацненні акцэнтаў па ўзаемадзеянні з Беларуссю, па інтэнсіфікацыі гандлёвага супрацоўніцтва.

«Санкцыйны прэсінг нас яшчэ больш зблізіў, нават аб'яднаў. І спрыяе рэалізацыі партнёрскіх праектаў, якія я згадваў, і многіх іншых», — адзначыў губернатар Валагодскай вобласці.

Георгій Філімонаў звярнуў увагу, што, акрамя эканамічнага, трэба развіваць і гуманітарнае супрацоўніцтва. Валагодская вобласць — гэта 189 асабліва ахоўных прыродных тэрыторый, гэта чатыры тысячы азёр, гэта велізарная культурная і рэлігійная спадчына. Губернатар упэўнены, што патэнцыял для беларускіх турыстаў каласальны, ён будзе пашырацца і раскрывацца.

## У тэму

### АПК, ВОДАЗАБЕСПЯЧЭННЕ, БУДМАТЭРЫЯЛЫ, ЛІФТЫ І ТЭХНІКА

**Намеснік Прэм'ер-міністра Віктар КАРАНКЕВІЧ на сустрэчы з губернатарам Валагодскай вобласці Георгіем ФІЛІМОНАВЫМ расказаў пра перспектывы супрацоўніцтва з расійскім рэгіёнам.**

Віктар Каранкевіч адзначыў, што па выніках мінулага года тавараабарот харчовымі таварамі перавысіў 10,2 мільёна долараў.

— Гэта максімальны паказчык за апошнія пяць гадоў, аднак гэта толькі 1,5 % у агульным аб'ёме тавараабароту з рэгіёнам. Мы гатовыя нарошчваць пастаўкі беларускага харчавання, — адзначыў ён.

Актуальна і супрацоўніцтва ў будаўнічым комплексе.

— Актыўна ідуць узаемныя пастаўкі будаўнічых матэрыялаў. Спадзяюся на ўзаемавыгаднае развіццё гэтага кірунку гандлю, — падкрэсліў віцэ-прэм'ер.

Ён звярнуў увагу, што беларускія кампаніі пакуль не ўдзельнічалі ў будаўніцтве ў Валагодскай вобласці, але вопыт супрацоўніцтва з іншымі расійскімі рэгіёнамі маецца.

— У цяперашні час намі актыўна ажыццяўляюцца праектаванне і будаўніцтва

# «МЫ ПЕРААДОЛЕЕМ І ЦЯЖКАСЦІ»

## вялікія перспектывы пашырэння супрацоўніцтва

мы развіваемся так, як павінны развівацца славянскія народы. Тут размоў быць не можа. Таму мы хацелі б, каб у нас былі самыя добрыя і цёплыя адносіны», — патлумачыў кіраўнік дзяржавы.

### МАШЫНАБУДАВАННЕ, БУДАЎНІЦТВА, ХАРЧАВАННЕ...

На сустрэчы з губернатарам Валагодскай вобласці Георгіем Філімонавым беларускі лідар пералічыў кірункі, па якіх можна нарасціць супрацоўніцтва.

У студзені — чэрвені гэтага года тавараабарот паміж Беларуссю і Валагодскай вобласцю склаў 316,4 мільёна долараў, што складае 100,9 % да ўзроўню аналагічнага перыяду 2024-га. У цэлым за апошнія гады паказчык рос: калі ў 2020-м тавараабарот складаў 335 млн долараў, то ў 2024 годзе дасягнуў 678,1 мільёна. Аляксандр Лукашэнка назваў тэмпы росту тавараабароту прыстойнымі. І пазначыў кірункі супрацоўніцтва, па якіх іх можна павялічыць.

Беларусь — машынабудаўнічая краіна і пастаўляе шмат тэхнікі на экспарт. Валагодчына таксама набывае шмат рознай беларускай тэхнікі, знаёмая з ёй. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў кожнай тэхнікі ёсць свае недахопы. «Але мы вам удзячныя за тое, што вы ацанілі нашу тэхніку і лічыце яе адной з прымальных па цане і якасці для вашай вобласці. Гатовыя прапанаваць мы індывідуальныя фінансавыя праграмы для Валагодчыны і прадугледзець сэрвіснае абслугоўванне ўсёй той тэхнікі, якая будзе працаваць у вас», — прапанаваў Прэзідэнт. Паводле яго слоў, гэта нават не павінна абмяркоўвацца: неабходна хаця б асноўнае сэрвіснае абслугоўванне тэхнікі, якая пастаўляецца на экспарт. І важна, каб былі людзі, якія будуць займацца сэрвісам.

Наступны кірунак — трактарабудаванне. «Трактар вельмі любімы ў вашай вобласці і ў Расіі ў цэлым. Выпускаецца, як мяне інфармуюць, каля 10 мадыфікацый і прыкладна столькі ж спецмашын на базе нашых трактароў. Мы гатовыя да пашырэння гэтай лінейкі і зацікаўлены ў развіцці сумесных вытворчасцяў трактароў па ўсіх гэтых мадэлях», — прапанаваў беларускі лідар.

Валагодчына, як і ўся Расія, і постсавецкая прастора, і Беларусь, зацікаўлена ў пастаўках ліфтаў, таму што адбываецца іх масавая замена ў дамах яшчэ савецкай забудовы. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што Беларусь гатова працаваць разам з Валагодчынай у гэтым кірунку. І прапанаваў узяць за ўзор досвед супрацоўніцтва з Санкт-Пецярбургам.

«Па харчаванні. Калі вам патрэбныя нейкія аб'ёмы харчавання. Я ведаю, што вы і так паспяховыя ў гэтых адносінах, але ўсё ж такі вобласць адносна паўночная, магчыма, нейкія прадукты харчавання патрэбныя. Вы скажыце — мы гатовыя з вамі супрацоўнічаць», — пазначыў беларускі лідар.

Наступны кірунак — будаўніцтва. «Нашы магчымасці вы ведаеце. Мы гатовыя працаваць з вамі не толькі ў галіне будаўніцтва, але і аддзелачных работ, і перш за ўсё аказваць праектныя паслугі. У нас вельмі магутны сектар, які займаецца праектаваннем і прамысловых прадпрыемстваў, і грамадскіх будынкаў, і жылля. Калі будзе ў вас неабходнасць, мы гатовыя з вамі ў гэтым кірунку працаваць», — прапанаваў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт вылучыў і гуманітарнае супрацоўніцтва. «Вы як руская сапраўдная глыбінка аддаяна нашым каштоўнасцям, агульным каштоўнасцям. Вы шмат робіце, каб абараніць нашу гістарычную памяць. Вы ведаеце нашу палітыку ў Беларусі: мы не зносім помнікі — мы іх будуем», — сказаў ён. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што ў Беларусі заўсёды гатовы прыняць людзей, якія хочуць наведаць нашы мемарыяльныя комплексы і азнаёміцца з беларускай гісторыяй. «Мы вам вельмі ўдзячныя за тое, што ў Чарапаўцы (я ведаю, што гэта была ваша ініцыятыва) адкрылі выпускнікам Лепельскага і Чарапавецкага ваенных вучылішчаў помнік. Гэта вельмі важна», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Рэзюмуючы, кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што кірункаў, традыцыйных і тыповых для супрацоўніцтва Беларусі і рэгіёнаў Расіі, мноства. «Мы гатовыя іх разглядаць, і вельмі хацелася б, каб яны былі адлюстраваны ў сумесным дакуменце, які, як я разумею, вы гатовыя падпісаць з урадам Беларусі. Мы будзем рабіць усё, каб рэалізаваць нашы дамоўленасці. Дзякуй вам і вашым калегам, што прыехалі да нас. Калі будзем актыўнічаць у гэтым кірунку, мы пераадолеем усякія складанасці і цяжкасці, у тым ліку і санкцыйнага характару», — падкрэсліў ён.

### «МЫ НОСЬБІТЫ АДНАГО КУЛЬТУРНАГА ГІСТАРЫЧНАГА КОДА»

У адказ Георгій Філімонаў прызнаўся: нягледзячы на тое, што ў Мінску першы раз, адчувае сябе тут як дома. «Мы прадстаўнікі адзінага дрэва. Мы носьбіты аднаго культурнага гістарычнага кода. У нас агульная спадчына. У нас агульная перамога, мы сустракаемся ў год 80-годдзя Вялікай Перамогі, і мы вельмі цэнім подзвіг нашых продкаў, якія далі нам саму магчымасць жыць, нараджаць дзяцей, развівацца і перадаваць гэтую памяць з пакалення ў пакаленне. Мы з нашымі беларускімі братамі і паплечнікамі змагаемся за гістарычную праўду, адстойваем гістарычную справядлівасць, і мы перамагаем», — адзначыў губернатар Валагодскай вобласці.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

---

сацыяльных аб'ектаў у Калужскай, Ленінградскай, Уладзімірскай і Ніжагародскай абласцях.

Паводле яго слоў, спецыялісты «Белдзяржпраекта» і «Белпрампраекта» могуць прапанаваць свой вопыт у праектаванні аб'ектаў прамысловага, сацыяльнага і грамадзянскага прызначэння на тэрыторыі Валагодскай вобласці.

Акрамя таго, з 2009 года беларускія прадпрыемствы актыўна ўдзельнічаюць у мерапрыемствах па паляпшэнні водазабеспячэння жыхароў Валагодскай вобласці. За гэты перыяд прадпрыемствам «Палімерканструкцыя» 10 аб'ектаў паспяхова ўведзены ў эксплуатацыю, з іх 4 — у 2024 годзе. У прапрацоўцы 7 ачышчальных збудаванняў Сакольскага раёна Валагодскай вобласці.

Віктар Каранкевіч расказаў, што ўрады Беларусі і Валагодскай вобласці падпішуць праграму развіцця супрацоўніцтва на 2026—2028 гады. На яго думку, яна павінна стаць рабочым накіравальным інструментам для далейшага развіцця ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва.

Беларусі таксама цікавы праект па стварэнні сумеснай вытворчасці ліфтаў. Прамыя сувязі Беларусі з рэгіёнамі Расіі заўсёды былі адным з прыярытэтаў двухбаковага супрацоўніцтва і асновай яго гандлёва-эканамічнага складніка, адзначыў Віктар Каранкевіч.

— У нас нядрэнныя паказчыкі ўзаемнага гандлю, — сказаў ён. — Тут назіраецца невялікая пазітыўная дынаміка. Пры гэтым лічу, што патэнцыял для росту далёка не вычарпаны.

Віцэ-прэм'ер прапанаваў губернатару расійскага рэгіёна падрабязна разгледзець усе наяўныя і перспектыўныя магчымасці супрацоўніцтва Валагодскай вобласці з «МЛМ Неўскі ліфт» і «Магілёўліфтмаш» па пастаўках ліфтавага абсталявання ў рэгіён, уключаючы стварэнне сумеснага прадпрыемства ў Валагодскай вобласці.

Прыярытэтным кірункам супрацоўніцтва бакоў застаецца прамысловы комплекс.

— Мы зацікаўлены ўдзельнічаць у абнаўленні парку сельскагаспадарчай тэхнікі ў гаспадарках Валагодскай вобласці, беларускія машынабудаўнікі здольныя задаволіць любыя запыты валагодскіх аграрыяў. Спадзяёмся на маштабную падтрымку закупак беларускай сельскагаспадарчай тэхнікі з прыцягненнем сродкаў рэгіянальнага бюджэту. Таксама гатовыя прапанаваць свае фінансавыя інструменты і лізінгавыя схемы льготнага фінансавання на набыццё беларускіх машын, — звярнуў увагу віцэ-прэм'ер.

Беларускі бок бачыць перспектывы ў развіцці зборачнай пляцоўкі трактароў на базе АТ «Чарапавецкі ліцейна-механічны завод», пашырэнні лінейкі выпускаемай тэхнікі, а таксама паглыбленні лакалізацыі яе вытворчасці. Віктар Каранкевіч адзначыў, што краіна гатовая пастаўляць для рэгіёна экалагічна чысты электратранспарт «МАЗ» і «Белкамунмаш».

Акрамя таго, беларускія прадпрыемствы гатовыя прапанаваць як муніцыпальным, так і прыватным перавозчыкам рэгіёна шырокую лінейку выпускаемай пасажырскай тэхнікі.

Віктар Каранкевіч таксама запрасіў дэлегацыю Валагодскай вобласці паўдзельнічаць у Міжнароднай прамысловай выстаўцы «Інапрам. Беларусь», якая ўпершыню будзе праводзіцца ў Мінску ў канцы верасня — пачатку кастрычніка 2025 года.

Дарэчы, за паўгоддзе 2025 года тавараабарот паміж Беларуссю і Валагодскай вобласцю склаў 316,4 мільёна долараў, што складае 100,9 % да ўзроўню аналагічнага перыяду 2024-га. У цэлым за апошнія гады паказчык дэманстраваў рост: калі ў 2020 годзе тавараабарот складаў 335 мільёна долараў, то ў 2024-м лічба ўзаемнага гандлю дасягнула 678,1 мільёна долараў.

Асновай беларускага экспарту сталі прылады на вадкіх крышталях, лазеры, трактары і седлавыя цягачы, часткі і прылады аўтамабіляў і трактароў, азотныя ўгнаенні і іншае. З Валагодскай вобласці ў Беларусь пераважна пастаўляліся плоскі пракат з розных відаў сталі, дрот, медзь і медныя сплавы, адходы і лом чорных металаў, а таксама іншыя віды прадукцыі.

**Па матэрыялах БелТА.**

---

АКЦЭНТЫ

## ТУРЫЗМ У ПРЫЯРЫТЭЦЕ

### Гэты кірунак развіцця адносін Беларусі і Расіі абмеркавалі ў Доме ўрада

Прэм'ер-міністр Аляксандр Турчын учора правёў сустрэчу з віцэ-прэм'ерам Расійскай Федэрацыі Дзмітрыем Чарнышэнкам, на якой бакі абмеркавалі развіцце адносін у сферы турызму

Прэм'ер-міністр звярнуў увагу, што апошнім часам ва ўрадах абедзвюх краін вядзецца вельмі інтэнсіўная работа па многіх пытаннях. Аляксандр Турчын выказаў упэўненасць, што з улікам курыруемых напрамкаў тэм для зносін з віцэ-прэм'ерам Расіі можна знайсці незлічоную колькасць праектаў. Тым не менш у Доме ўрада больш за ўсё акцэнтавалі ўвагу на адным кірунку — турызме.



— Мы для сябе на наступную пяцігодку ставім турызм адным з прыярытэтаў развіцця нашай краіны, — адзначыў кіраўнік урада.

Падчас сваіх візітаў беларускі Прэм'ер-міністр не раз звяртаў увагу на развіццё гэтага кірунку ў Расіі, а таксама абмяркоўваў сумесныя праграмы і планы.

— Улічваючы вялікую колькасць турыстаў з нашых краін, якія штогод наведваюць і Беларусь, і Расію, мы можам дзесьці сінхранізаваць нашы намаганні, абмяняцца вопытам па прадуктах падтрымкі турызму, праграмах развіцця турызму, — патлумачыў ён.

У сваю чаргу Дзмітрый Чарнышэнка звярнуў увагу, што Беларусь для Расіі — найбліжэйшы саюзнік і стратэгічны партнёр.

— Нашы краіны звязваюць цёплыя, брацкія, сяброўскія адносіны, агульная гісторыя, культурнае сваяцтва. Самае галоўнае — мы падзяляем аднолькавыя традыцыйныя каштоўнасці і прынцыпы справядлівасці.

Ён звярнуў увагу на тое, што ўзаемны турыстычны паток стабільна расце.

— Паводле нашай афіцыйнай статыстыкі, летась здзейснена каля 670 тысяч узаемных паездак. Мы разумеем, што гэта лічба павінна быць большай, таму будзем прыкладаць усе намаганні.

Расійскі віцэ-прэм'ер адзначыў, што з 2021 года гэта лічба расце прыкладна па 10 % у год.

— Гэта вельмі сур'ёзны рост, і амбіцыйныя задачы нам пастаўлены Прэзідэнтам — падвоіць турыстычны паток. Урады нашых краін павінны прыкласці ўсе намаганні, каб рэалізаваць велізарны турыстычны патэнцыял у Саюзнай дзяржаве, — заключыў ён.

ЖНІВО-2025

# СЛУЖБА НА ХЛЕБНАЙ НІВЕ

## Як супрацоўнікі ўнутраных спраў дапамагаюць аграрыям

### ХЛЕБАРОБЫ Ў ПАГОНАХ

Свой унёсак у агульнанацыянальны каравай уносяць і супрацоўнікі органаў унутраных спраў. Па асабістым даручэнні міністра ўнутраных спраў Івана Кубракова сёлета быў сфарміраваны механізаваны атрад з ліку міліцыянераў для аказання дапамогі сельскагаспадарчым арганізацыям Магілёўскай вобласці ў правядзенні палявых работ 2025 года.

Абавязковае патрабаванне да хлебаробаў у пагонах — наяўнасць пасведчання аб праве кіравання камбайнам і практычны навык. У склад механізаванага атрада ўвайшлі 20 супрацоўнікаў тэрытарыяльных органаў унутраных спраў. Сярод іх — участковыя інспектары міліцыі, супрацоўнікі крымінальнага вышуку, аператыўных дзяжурных і іншых службаў, інспектары ДАІ.

«У пачатку ліпеня на базе Цэнтра падрыхтоўкі, павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі рабочых камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Магілёўскага аблвыканкама ўсе яны прайшлі перападрыхтоўку па ўладкаванні, правілах эксплуатацыі і тэхнічным абслугоўванні збожжаўборачнай і кормаўборачнай тэхнікі, што выпускаецца на ААТ «Гомсельмаш», — адзначае **намеснік начальніка УУС Магілёўскага аблвыканкама Сяргей КРАСНОЎ**. — У ААТ «Кіруючая кампанія холдынга «Аграмашсэрвіс» г. Магілёва для супрацоўнікаў адбыўся дадатковы інструктаж, пасля чаго яны прыступілі да падрыхтоўкі атрыманых дзесяці новых камбайнаў».

У канцы ліпеня міліцэйскі працоўны дэсант высадзіўся ў шэрагу сельгаспрадпрыемстваў вобласці. Супрацоўнікі органаў унутраных спраў задзейнічаны ва ўборцы ў ААТ «Ліпаўка» Хоцімскага раёна, ААТ «Краснапольскі», ААТ «Горацкая райаграпрамтэхніка» і ААТ «Маслакі» Горацкага раёна, а таксама ААТ «Круглянскі аграпрамтэхзаб», дзе да гэтага часу аказваюць дапамогу аграрыям. Толькі намаганнямі механізаванага атрада на Магілёўшчыне ўбрана звыш 7000 тон збожжавых культур.

### З РАЗУМЕННЕМ ДА ВАЖНАЙ СПРАВЫ

Каб даведацца, ці асвоілі міліцыянеры працу хлебароба і як спраўляюцца з пастаўленымі задачамі, мы накіраваліся ў аграгарадок Комсенічы Круглянскага раёна. На пад'ездзе да поля размінуліся з напоўненымі збожжам самазваламі: едуць на зернесушыльны комплекс. Работа на палетках кіпіць з самай раніцы. У гарачы час жніва кожная хвіліна на вагу золата.

На гэтых палетках працуе тры экіпажы аграрыяў у пагонах. Як звяртае ўвагу **дырэктар ААТ «Комсенічы» Дзмітрый БОЙКА**, сёлета дапамога праваахоўнікаў як ніколі патрэбна. Уборка збожжавых, па яго словах, практычна завершана. Камбайнеры, у тым ліку з міліцэйскага складу, заканчваюць жаць трыцікале.

«З усімі задачамі супрацоўнікі органаў унутраных спраў спраўляюцца на выдатна, — падкрэслівае дырэктар сельгаспрадпрыемства. — Да работы хлопцы ставяцца з усёй душой, з поўнай аддачай — так, як да службовай справы. Відаць, што ведаюць справу механізатара, добрасумленна адносяцца да тэхнікі. Ніякай розніцы няма: убірае хлеб прафесійны камбайнер або не».

Дзмітрый Бойка выказвае ўдзячнасць усім, хто ўдзельнічаў у прыняцці рашэння накіраваць у гаспадарку праваахоўнікаў. «Можна з упэўненасцю сказаць, што чаканні апраўданы, — канстатуе ён. — Нягледзячы на капрызы надвор'я, у гэту ўборачную мы пераўзыдзем сябе, як бы ні было складана. Без міліцыянераў гаспадарка не справілася б. Ведаючы, з якім разуменнем супрацоўнікі падышлі да важнай справы, можна сказаць, што яны героі».

Акрамя таго, прысутнасць вартавых правапарадку ў гаспадарцы, па словах яе кіраўніка, дысцыплінуе астатніх работнікаў. Як вынік — адсутнічаюць факты крадзяжу гандлёва-матэрыяльных каштоўнасцяў.



Фота прэс-службы Магілёўскага УУС.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

ПРЫРОДА І МЫ

# У ІМЯ ЭКАЛАГІЧНА ЧЫСТАЙ БУДУЧЫНІ

## Чым запомніцца XVIII Рэспубліканскі экалагічны форум

У маштабным двухдзённым мерапрыемстве, арганізаваным Мінпрыроды ў супрацоўніцтве Мінаблвыканкамам, якое праходзіла ў Дзяржынскім раёне, прынялі ўдзел больш за 400 дэлегатаў ад рэгіёнаў, прадстаўнікоў прыродаахоўных ведамстваў, навуковых колаў, маладзёжных аб'яднанняў і іншых неабыякавых да прыроды грамадзян.



За час работы XVIII Рэспубліканскага экалагічнага форума былі разгледжаны не толькі тэарэтычныя пытанні. У рамках другога дня быў адкрыты шэраг знакавых аб'ектаў раёна. Сярод іх мадэрнізаваны гідралагічны помнік прыроды рэспубліканскага значэння «Юцкаўская крыніца», рэканструкцыя якога была ініцыявана ў 2025 годзе з-за разбурэння маста да латкоў з крынічнай вадой.

— Гэта сапраўдны падарунак не толькі для жыхароў Дзяржынскага раёна, але і для мноства турыстаў з усёй Беларусі. Гэта крыніца не толькі чыстай пітной вады, але і частка нашай гісторыі, сімвал жыцця,



прыроднай шчодрасці і дабрабыту, — падкрэсліў **міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Сяргей МАСЛЯК** на цырымоніі ўрачыстага адкрыцця і асвячэння крыніцы. Ён таксама адзначыў, што ў добраўпарадкаванні яе тэрыторыі прынялі ўдзел працоўныя калектывы, прадстаўнікі дзяржаўных органаў і сілавых структур, а таксама неабыякавыя грамадзяне ўсіх узростаў.

Цяпер для наведвальнікаў экатурыстычнай жамчужыны Дзяржынскага раёна добраўпарадкавана аўтастаянка, устаноўлена крытая альтанка. Замест драўлянага насцілу — трывалая платформа, а латкі выкананы з нержавеючай сталі. На ўваходзе ў крыніцу з'явілася прыгожая каваная арка.

Былі адкрыты падчас форуму і экалагічная сцежка ў Дзяржынску, дзіцячая спартыўная пляцоўка «КРУТАгор'е», абноўлены экалагічны аб'ект «Гара Дзяржынская». Тут, на 345 м над узроўнем мора, на самым высокім месцы Беларусі, падвялі вынікі маштабнага рэспубліканскага мерапрыемства.

— Гэта былі добрыя два дні, напружаныя, поўныя цікавых дыскусій, сустрэч, уражанняў, эмоцый. Я ўпэўнены, што ўсе прапановы ў будучыні лягуць у аснову кіраўніцкіх рашэнняў, накіраваных на ахову навакольнага асяроддзя, — падзяліўся ўражаннямі аб форуме Сяргей Масляк і шчыра падзякаваў яго арганізатарам і ўдзельнікам.

— XVIII Рэспубліканскі экалагічны форум — гэта сапраўды значная старонка не толькі для Дзяржынскага раёна, але і для ўсёй Мінскай вобласці. Форум стаў пляцоўкай для канструктыўнага плённага дыялогу паміж прадстаўнікамі ўлады, бізнесу, навукі, грамадскіх арганізацый. Абмяркавалі актуальныя пытанні аховы навакольнага асяроддзя, захаванне біялагічнай разнастайнасці, наступствы змяненняў клімату і іншыя экалагічныя выклікі нашага часу, — адзначыў **старшыня Дзяржынскага райвыканкама Мікіта РЭУТ**. Ён падкрэсліў, што поспех агульнай місіі залежыць ад сумесных рашучых і скаардынаваных дзеянняў, і выказаў упэўненасць, што кожны ўдзельнік знайшоў новыя ідэі, карысныя ў яго практычнай дзейнасці.

**Вызначана месца правядзення наступнага Рэспубліканскага экалагічнага форуму. У 2027 годзе яго прыме Магілёўская вобласць.**

**Александрына ПАРШЫНА, фота аўтара.**




## «ТЫСЯЧУ НАМАЛАЦІЎ І ГАНАРУСЯ ГЭТЫМ!»

Самааддачу і адказны падыход да важнай справы дэманструе і намалот кожнага супрацоўніка. Неўзабаве ўсе міліцэйскія экіпажы перасягнуць тысячны рубеж. Запаветнай для кожнага хлебароба лічбы ўжо дасягнуў экіпаж у складзе **старшага аператыўнага дзяжурнага аператыўнай службы Круглянскага РУУС Дзмітрыя РАМАНАВА** і **старшага оперупаўнаважанага аддзела крымінальнага вышуку Ленінскага РАУС г. Магілёва Алега БОГДАНА**.

Як расказвае Дзмітрый Раманаў, адно з найбольш папулярных пытанняў хлебаробу — «Ты тысячу намалаціў?» «Я намалаціў і вельмі ганаруся гэтым, — адзначае міліцыянер. — Тысяча для хлебароба — пэўнае дасягненне, вынік».

Ён гаворыць, што пайшоў ужо чацвёрты тыдзень, як яны з калегамі знаходзяцца ў службовай камандзіроўцы. У працу, па яго словах, уцягнуліся хутка. Працэс забяспечваюць поўнасцю. Раніцай запраўляюцца — і ў поле. Да месца адпачынку вяртаюцца на змярканні, а бывае, што і ў цемры. Адным словам, цэлы дзень у полі.

«Поўная аддача рабоце — для міліцыянераў справа звычайная, — заўважае Дзмітрый Раманаў. — Нам не прызвычайвацца і не спаць, і да іншых цяжкасцяў. Новага нічога мы не ўбачылі. На стомленасць ніхто не наракае. Да працяглай камандзіроўкі сем'і адносяцца з разуменнем, бо выконваем, можна сказаць, нацыянальную задачу. Хлеб ядуць усе, таму і працаваць павінны ўсе. Пры гэтым максімальна якасна».

Да працы на хлебнай ніве аграрыі ў пагонах паміж сабой знаёмыя не былі. Агульная справа зблізіла. Тут набылі новых сяброў.

Алег Богдан на жніве задзейнічаны не ўпершыню. Падобны вопыт удзелу ва ўборачнай кампаніі ўжо быў. У свой час вартавы правапарадку вучыўся ў сельскагаспадарчым вучылішчы. Падчас адной з практык у якасці памочніка камбайнера каля месяца шчыраваў на палетках.

«Мяне часта пытаюць: дзе лягчэй — на службе ці на ўборцы ўраджаю, — расказвае старшы оперупаўнаважаны аддзела крымінальнага вышуку Ленінскага РАУС г. Магілёва. — Адназначна адказаць цяжка, бо задачы аднолькава важныя. Ёсць нават пэўныя агульныя моманты. І на службе, і на жніве не лічышся з асабістым часам, атрымліваеш маральнае задавальненне і, самае галоўнае, бачыш вынік зробленага. Толькі тут ён вымяраецца ў намалотах, а ў міліцыі — бяспекай грамадзян».

Першых тысячнікаў сярод вартавых правапарадку на палетках віншавала кіраўніцтва мясцовай улады і міліцэйскага ведамства. Ад імя начальніка УУС генерал-маёра міліцыі Ігара Шчарбачэня за добрасумленную працу супрацоўнікі атрымалі Падзякі і памятныя падарункі.

«Прыемна бачыць, што, нягледзячы на няпростыя ўмовы надвор'я, вы працуеце з поўнай аддачай і паказваеце выдатныя вынікі: кожны з дзевяці экіпажаў міліцэйскага атрада камбайнераў ужо наблізіўся да паказчыка ў тысячу тон намалоту, — адзначыў Сяргей Красноў. — Гэта сведчыць аб адказнасці і дысцыпліне, якія вы паказваеце як на службе, так і ў полі. Бачачы вашу мэтанакіраванасць, упэўнены, што ўбраць вырашчаны ўраджай атрымаецца ў тэрмін».

Пакуль матэрыял рыхтаваўся да друку, хлебаробы ў пагонах завяршылі ўборачныя работы на Кругляншчыне і накіраваліся на дапамогу аграрыям у Бялыніцкі раён. Неўзабаве і з гэтых палеткаў будуць навіны пра тысячнікаў сярод вартавых правапарадку.

**Вераніка КАНЮТА.**

АКТУАЛЬНА

# АД НАЦЫЯНАЛЬНАГА ПЛАНА ДА ГЛАБАЛЬНАЙ СТРАТЭГІІ

## Як развіваецца «зялёная» эканоміка

Наша краіна сёння рэалізуе Нацыянальны план дзеянняў па развіцці «зялёнай» эканомікі на 2021—2025 гады. Як адзначыла намеснік начальніка ўпраўлення экалагічнай палітыкі, навукі і інфармацыі Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Алена МЯЛЕШКАВА, цяпер Беларусь актыўна рэалізуе меры дзяржаўнай палітыкі, накіраваныя на ўкараненне прынцыпаў цыркулярнай эканомікі, якія забяспечваюць значнае зніжэнне нагрузкі на экасістэмы пры нарошчванні перапрацоўкі матэрыяльных рэсурсаў на ўсіх этапах жыццёвага цыкла тавараў і паслуг. Гэта дазваляе не толькі знізіць аб'ём стварэння адходаў, але і садзейнічае вырашэнню праблем высокай вугляроднай ёмістасці эканомікі, у тым ліку за кошт павышэння энергаэфектыўнасці, а таксама зніжэння залежнасці ад імпарту рэсурсаў.

### НОВЫЯ МАГЧЫМАСЦІ

У рамках рэалізацыі Нацыянальнага плана дзеянняў па развіцці «зялёнай» эканомікі ўзровень выкарыстання цвёрдых камунальных адходаў вырас з 33,9 % у 2022 годзе да 39,6 % летась. Сёння каля 10 % прадпрыемстваў ужывае прынцыпы эканомікі замкнёнага цыкла. А ўзровень выкарыстання адходаў вытворчасці (без уліку буйнатанажных) склаў каля 90 %.

На беларускіх прадпрыемствах рэалізуюцца меры па ўкараненні энергаэфектыўных тэхналогій і абсталявання, якія прыводзяць да зніжэння аб'ёму стварэння адходаў, уключэння ў паліўны баланс аднаўляльных крыніц энергіі. Ствараюцца новыя магчымасці для дадатковай занятасці насельніцтва.

Як адзначыла Алена Мялешкава, праекты па энергаэфектыўнай вытворчасці рэалізуюцца на прадпрыемствах па перапрацоўцы сельскагаспадарчай сыравіны, а таксама ў галіне вытворчасці будаўнічых матэрыялаў і вырабаў. Экалагічныя інавацыі і «зялёныя» тэхналогіі ўкараняюцца ў дрэваперапрацоўчай, папяровай, шкляной, хімічнай і харчовай прамысловасці, металургіі і іншых сферах эканомікі.



У прыватнасці, у мінулым годзе ў Беларусі ўтварылася каля 60 мільёнаў тон адходаў. Пры гэтым 4,3 млн тон прыпадае на цвёрдыя камунальныя, яшчэ 55,3 млн тон — адходы вытворчасці, з якіх 70 % — так званыя буйнатанажныя. У апошнім выпадку гаворка ідзе пра галітавыя адходы і глініста-солевыя шламы, якіх утвараецца больш за 35 мільёна тон у год, а таксама адходы фосфагіпсу, якіх штогод атрымліваецца 830 тысяч тон. Працэнт выкарыстання адходаў вытворчасці па выніках 2024 года з улікам буйнатанажных — каля 33 %.

Спецыялісты падкрэсліваюць, што праблема ўтварэння, збору і перапрацоўкі адходаў становіцца яшчэ больш вострай у сучасным свеце. Развіццё прамысловай вытворчасці прыводзіць да павелічэння адпаведных аб'ёмаў. Няправільнае абыходжанне можа прывесці да забруджвання навакольнага асяроддзя, пагаршэння якасці вады, паветра, глебы і, як следства, негатыўных наступстваў для здароўя чалавека. Пры гэтым шэраг адходаў можа быць перапрацаваны. Такім чынам, іх стварэнне і выкарыстанне мае не толькі экалагічны, але і эканамічны складнік.

У Беларусі ўжо працуе звыш 80 ліній па сартаванні цвёрдых камунальных адходаў і 9 смеццеперапрацоўчых заводаў, якія з кожным годам нарошчваюць магутнасці.

### НА ГАДЫ НАПЕРАД

Як паведаміў **намеснік начальніка ўпраўлення рэгулявання абыходжання з адходамі Міністэрства прыроды і аховы навакольнага асяроддзя Максім ТАРАСАЎ**, у нашай краіне 18 жніўня была прынята пастанова Савета Міністраў № 444 «Аб стратэгіі па абыходжанні з адходамі вытворчасці і спажывання ў Рэспубліцы Беларусь». Яе мэта — забяспечыць да 2040 года не менш чым 90-працэнтнае выкарыстанне адходаў. Такога ўзроўню плануецца дасягнуць за кошт максімальнага скарачэння антрапагенных выкідаў і рэалізацыі экалагічных праектаў, накіраваных на паглынанне парніковых газаў (аднаўленне лясоў, рэабілітацыя парушаных тарфянікаў), пры энергетычным выкарыстанні (спальванні) адходаў.

Плануецца прыняць шэраг мер, у тым ліку вызначыць адзіны дзяржаўны орган для рэгулявання і кантролю ў сферы абыходжання з адходамі, выпрацаваць адзіныя падыходы да абыходжання з адходамі спажывання і адходамі вытворчасці, падобнымі да адходаў жыццядзейнасці насельніцтва.

У планах таксама абмежаванне празмернага выкарыстання ўпакоўкі пры вытворчасці тавараў (напрыклад, аб'ём упакоўкі не больш за 50 % ад аб'ёму тавару), стымуляванне выкарыстання экалагічна бяспечнай (якая перапрацоўваецца) упакоўкі, вызначэнне пераліку відаў прадукцыі, пры вытворчасці якой неабходна выкарыстоўваць другасныя матэрыяльныя рэсурсы. Акрамя таго, мяркуецца вызначыць пералік відаў прадукцыі (тавараў), вытворчасць якіх не дапускаецца ў сувязі з тым, што адходы ад іх выкарыстання не падлягаюць далейшай перапрацоўцы альбо іх перапрацоўка складаная.

У Беларусі плануюць удасканальваць заканадаўчую базу і сістэму збору і ўліку адходаў, укараняць безадходныя і малаадходныя тэхналогіі. У планах развіваць раздзельны збор смецця і сістэму нарыхтоўкі другасных матэрыяльных рэсурсаў і тэкстыльных адходаў праз сетку прыёмных пунктаў, паэтапна закрываць смеццеправоды ў шматкватэрных жылых дамах, мадэрнізаваць кантэйнеры і смеццявозы, будаваць новыя аб'екты па сартаванні і выкарыстанні цвёрдых камунальных адходаў, а таксама палігоны для іх захавання.

Згодна з гэтым дакументам, у нашай краіне будзе створана біржа для гандлю другаснымі матэрыяльнымі рэсурсамі (ДМР). Біржа аб'ядноўвае вытворцаў адходаў і суб'ектаў гаспадарання, якія выкарыстоўваюць адходы, наладзіць узаемадзеянне паміж названымі асобамі праз лоты пакупкі і продажу ДМР. Таксама ў рамках стратэгіі будзе працаваць адзіны анлайн-рэсурс аб патоках адходаў і іх руху.

**Сяргей КУРКАЧ.**

ЖАЛЕЗНАЕ БРАТЭРСТВА

# ШАС — ГЭТА ЎНІКАЛЬНАЯ ПЛЯЦОЎКА ДЛЯ АДКРЫТАГА ДЫЯЛОГУ



Маючы адбыцца саміт Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва ў Кітаі стане ўнікальнай пляцоўкай для адкрытага дыялогу, узгаднення пазіцый і выпрацоўкі калектыўных рашэнняў у сучасных вельмі турбулентных міжнародных умовах. Такі пункт гледжання выказаў БелТА першы намеснік міністра замежных спраў Сяргей ЛУКАШЭВІЧ напярэдадні запланаванага ў кітайскім Цяньцзіні з 31 жніўня па 1 верасня саміту ШАС, на які Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнку запрасіў Старшыня КНР Сі Цзіньпін. Першы намеснік міністра расказаў аб узаемадзеянні Беларусі ў рамках ШАС, а таксама аб усеабдымным супрацоўніцтве з Кітаем, якое з'яўляецца ўзаемавыгадным і набывае ўсё большыя маштабы.

***— Сяргей Уладзіміравіч, саміт з'яўляецца галоўным прыярытэтам кітайскага старшынства ў ШАС, на ім чакаецца прысутнасць лідараў больш як 20 краін, кіраўнікоў каля дзясятка міжнародных арганізацый, плануецца прыняцце Цяньцзіньскай дэкларацыі Савета кіраўнікоў дзяржаў-членаў і Стратэгіі развіцця ШАС на наступнае дзесяцігоддзе. У чым важнасць удзелу Беларусі ў гэтай маштабнай сустрэчы на найвышэйшым узроўні?***

— Пачну з таго, што праца Беларусі ў Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва мае гістарычны характар: практычна ўсё, што мы робім у яе рамках, робіцца ўпершыню ў гісторыі. І ў сувязі з гэтым хачу прывесці словы міністра замежных спраў Максіма Рыжанкова, які ў Цяньцзіні ў ліпені 2025 года ўпершыню ў якасці прадстаўніка Беларусі як паўнапраўнай дзяржавы-ўдзельніцы адзначыў, што першы год беларускага членства ў ШАС пацвердзіў правільнасць стратэгічнага курсу краіны на ўступленне ў арганізацыю.

**Наогул саміты Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва — гэта не проста фармальныя пасяджэнні. Гэта ўнікальная пляцоўка для адкрытага дыялогу, узгаднення пазіцый і выпрацоўкі калектыўных рашэнняў у атмасферы ўзаемнай павагі і раўнапраўя. Для Беларусі ўдзел у такім фармаце — гэта магчымасць сустрэцца з сусветнымі лідарамі ў сяброўскім коле, дзе сапраўды шануюцца давер і партнёрства. Такія перагаворы ствараюць умовы для больш скаардынаванага ўзаемадзеяння ў рамках шматбаковых механізмаў ШАС.**

За мінулы год Беларусь змагла максімальна нарасціць сваю прысутнасць на ўсіх кірунках дзейнасці ШАС і без разварушвання, актыўна ўключыцца ў работу. Так, забяспечаны ўдзел у правядзенні 25 нарад кіраўнікоў міністэрстваў і ведамстваў ШАС і 26 мерапрыемстваў на ўзроўні рабочых груп.



Мы пераканаліся, што ў рамках ШАС Беларусь можа рэалізоўваць свае стратэгічныя прыярытэты, садзейнічаць развіццю шматпланавага супрацоўніцтва і рабіць унёсак у агульныя праекты. Беларускі бок упэўнены, што па выніках саміту будуць прыняты рашэнні, якія ўмацуюць інстытуцыянальны патэнцыял ШАС. У першую чаргу — у сферы сумеснай барацьбы з трансгранічнымі выклікамі: тэрарызмам, кіберпагрозамі, наркатрафікам. У эканамічнай плоскасці мы разлічваем на прасоўванне ініцыятыў па спрашчэнні мытных працэдур, стымуляванні ўзаемных інвестыцый, развіцці лічбавай эканомікі і транспартнай узаемазвязанасці, падтрымцы «зялёнай» энергетыкі. Гатовы таксама папрацаваць і над пашырэннем гуманітарных абменаў. Усе гэтыя кірункі надзвычай важныя для Беларусі.

***— Кіраўнік беларускай дзяржавы таксама запрошаны на мерапрыемствы ў Пекіне па святкаванні 80-годдзя Перамогі ў Другой сусветнай вайне. Наколькі блізкія пазіцыі Беларусі і Кітая ў захаванні гістарычнай памяці?***

— Абедзве краіны разглядаюць падзеі Другой сусветнай вайны не проста як важную гістарычную старонку, а як фундаментальны элемент нацыянальнай ідэнтычнасці і дзяржаўнага наратыву. Для нас ключавым з'яўляецца перыяд Вялікай Айчыннай вайны. Усім вядома, што наша краіна аказалася ў ліку найбольш пацярпелых тэрыторый Савецкага Саюза. У нашай памяці асаблівае месца займае тэма гераізму, згуртаванасці народа і супраціўлення нацысцкай акупацыі.

У Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь замацавана, што дзяржава забяспечвае захаванне гістарычнай праўды і памяці аб гераічным подзвігу беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: «Няма больш высакароднай місіі, чым захаванне гістарычнай памяці ў імя светлай будучыні».

Для Кітая цэнтральным эпізодам стала Вайна супраціўлення японскай агрэсіі, якая суправаджалася мільёнамі ахвяр і найцяжэйшымі разбурэннямі. У гістарычнай памяці важныя стойкасць народа, ахвяры, прынесеныя ў імя Перамогі, роля Кітая як важнага фронту сусветнай барацьбы з фашызмам і мілітарызмам. Тут, як і ў Беларусі, дзяржава актыўна фарміруе і падтрымлівае гэты гістарычны наратыў, каб перадаць яго будучым пакаленням, умацаваць патрыятызм і падкрэсліць пераемнасць гістарычнай місіі.

Пазіцыі нашых лідараў у гэтым пытанні адзіныя. Падабенства падыходаў праяўляецца і ў тым, што абедзве краіны катэгарычна абвяргаюць спробы перагляду вынікаў Другой сусветнай вайны або прыніжэння ролі нашых народаў у разгроме агрэсараў.

**Важна і тое, што мы не проста ваявалі кожны са сваім ворагам на розных участках фронту, але і дапамагалі адзін аднаму. Мы ведаем імёны кітайскіх байцоў, якія змагаліся ў шэрагах Чырвонай Арміі і партызанскіх атрадах, падпольшчыкаў, якія змагаліся з фашыстамі ў Віцебску, шануем герояў-беларусаў, якія аддалі свае жыцці ў барацьбе з японскімі агрэсарамі ў небе і на зямлі Кітая.**

Таму Прэзідэнт Беларусі запрошаны лідарам КНР на ўрачыстыя мерапрыемствы, адным з якіх з'яўляецца парад у Пекіне з нагоды 80-годдзя Перамогі. Беларусь і Кітай адзіныя ў імкненні беражліва захоўваць і абараняць памяць аб вайне, разглядаючы яе як частку агульнай спадчыны, якую нельга дазволіць сказіць ці забыцца.

***— Узровень беларуска-кітайскага ўзаемадзеяння вельмі высокі — усепагоднае і ўсебаковае стратэгічнае партнёрства. Чым яно напоўнена і як развіваецца?***

— Беларуска-кітайскае супрацоўніцтва з моманту ўстанаўлення дыпламатычных адносін прайшло шлях ад асобных кантактаў да фармату «любое надвор'е ўсебаковага стратэгічнага партнёрства». За гэтыя гады была выбудавана моцная палітычная база, якую асабліва ўмацавала сяброўства лідараў дзвюх краін. Узаемныя візіты і сустрэчы на найвышэйшым і высокім узроўнях сталі рэгулярнымі, актыўна развіваюцца міжведамасныя і міжрэгіянальныя кантакты.

За тры дзесяцігоддзі Беларусь і Кітай прайшлі шлях ад простага гандлю да комплекснага, узаемавыгаднага стратэгічнага партнёрства, якое ахоплівае палітыку і эканоміку, навуку і тэхналогіі, транспарт, адукацыю, культуру і многія іншыя сферы. Цяпер Кітай — наш другі гандлёвы партнёр і адзін з лідараў па аб'ёме прамых інвестыцый. За апошнія 10 гадоў тавараабарот вырас больш як у 4,5 раза.

Сёння наш сумесны парадак дня адкрываюць навукова-тэхнічнае супрацоўніцтва і тэхналагічная мадэрнізацыя прамысловасці. Гэту тэму супрацоўніцтва сфармулявалі лідары Кітая і Беларусі па выніках давернага сяброўскага дыялогу. У сферы навукова-тэхнічнага ўзаемадзеяння ў 2024—2025 гадах рэалізаваны дзясяткі мерапрыемстваў, якія прадугледжваюць стварэнне і развіццё беларуска-кітайскіх платформ супрацоўніцтва і рэалізацыю сумесных навуковых і навукова-тэхнічных праектаў.

Дарэчы, у развіцці тэхналагічнага кірунку сёлета ў маі ў рамках Міжурадавага камітэта была створана двухбаковая Камісія па прамысловым супрацоўніцтве, а падчас візіту Аляксандра Лукашэнкі ў Кітай у чэрвені бягучага года адной з ключавых задач у супрацоўніцтве нашых краін быў абазначаны кірунак сумесных намаганняў на паглыбленне прамысловай каапераціі, як мінімум на наступныя два гады. Упэўнены, што менавіта прамысловая кааперацыя, тэхналагічнае партнёрства, укараненне сучасных тэхналогій і стварэнне сумесных высокатэхналагічных прадпрыемстваў стануць асноўнымі трэндамі супрацоўніцтва нашых дзяржаў у найбліжэйшай перспектыве.

Беларусь глядзіць пазітыўна і з упэўненасцю на перспектывы ўсепагоднага і ўсебаковага стратэгічнага партнёрства з Кітаем.

# «НІЯКАГА ДЫКТАТУ»

## Эксперт — пра магчымасць аднаўлення амерыканцамі дзейснага дыялогу з Масквой па шырокім спектры пытанняў

Тэма ўрэгулявання расійска-ўкраінскага крызісу была цэнтральнай для сусветных медыя апошнім часам: саміт лідараў Расіі і ЗША на Алясцы, сустрэча апошняга з Зяленскім у Белым доме, званок Трампа нашаму Прэзідэнту, інтэрв'ю Аляксандра Лукашэнкі Медыякарпарацы Кітая і наступная адкрытая гутарка на актуальныя тэмы геапалітыкі з беларускімі журналістамі. Чаму фокус увагі экспертнай супольнасці сканцэнтраваны на гэтым, распавёў намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах Алег ДЗЯЧЭНКА.



— Для нас, простых беларусаў, сёння важна ўстанаўленне трывалага міру ва ўсходнееўрапейскім рэгіёне, спыненне грамадзянскай вайны ў брацкай Украіне, аднаўленне ўзаемавыгаднага гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва з нашымі заходнімі суседзямі, зніжэнне палітычнай напружанасці аж да яе «абнулення» ў цэлым, — падкрэсліў ён.

Парламентарый нагадаў, што Прэзідэнт Беларусі неаднаразова выказваў сваю перакананасць у неабходнасці выключна мірнага вырашэння палітычнага крызісу ва Украіне:

— У тэлефоннай размове з Прэзідэнтам Дональдам Трампам ён адзначыў беспаспяховасць любых спроб ЗША націснуць на Расію і прымусіць яе дзейнічаць на шкоду ўласным нацыянальным інтарэсам.

Алег Дзячэнка канкрэтызаваў: гэта датычыцца выкарыстання інструментаў варожасці і ўльтыматумаў, дыскрымінацыйных мер у гандлі і фінансавай сферы, палітычных санкцый, уведзеных у парушэнне нормаў міжнароднага права.

**— Так рабіць нельга, — перакананы ён. — Ніякага дыктату і толькі павага да вялікай ядзернай дзяржавы дапаможа аднавіць амерыканцам дзейсны дыялог з Масквой па шырокім спектры пытанняў — ад эканамічнага супрацоўніцтва да спынення ваеннай эскалацыі на паўднёвым усходзе Украіны. Такая разумная рэкамендацыя Прэзідэнта Беларусі «новаму-старому» кіраўніку вашынгтонскай адміністрацыі.**

На яго думку, украінскі крызіс — гэта вынік геапалітычнай пасткі, у якую трапіла кіеўская ўлада ў гады кіравання дэмакратаў у ЗША і лібералаў у ЕС:

— Фактычна пры іх у амерыканскіх і еўрапейскіх палітычных і дзелавых колах распаўсюдзілася аксіёма, якая не патрабуе доказаў аб тым, што Расія больш не здольная абараняць свае геапалітычныя і геаэканамічныя інтарэсы, ператварылася ў «бензакалонку» і крок за крокам будзе саступаць пазіцыі на сусветнай арэне краінам «калектыўнага Захаду».

Алег Дзячэнка канстатаваў, што такая тактыка была паспяхова апрабавана больш за чвэрць стагоддзя таму, калі пад ціскам Вашынгтона і Брусэля былі перагледжаны галоўныя вынікі Другой сусветнай вайны, знішчана сістэма еўрапейскай бяспекі і пачалося беспардоннае паглынанне агрэсіўным ваенным блокам НАТА краін былой сацыялістычнай садружнасці і рэспублік Балтыі.

— У перспектыве заходнія палітыкі разглядалі магчымасць уцягвання ў арбіту свайго ўплыву Украіны і дзяржаў Паўднёвага Каўказа. Менавіта нахабнае прасоўванне НАТА ў напрамку меж Расіі і інспіраваны кампрадорскай буржуазіяй дзяржаўны пераварот ва Украіне паслужылі трыгерам да пачатку найбуйнейшага ў найноўшай гісторыі Еўропы кантынентальнага ваеннага канфлікту, спыніць які, як паказвае гістарычная практыка, вельмі няпроста, — адзначыў ён.

Суразмоўца нагадаў, што Беларусь не з'яўляецца бокам канфлікту і заўсёды выступала за спыненне ўзброенага супрацьстаяння на тэрыторыі Украіны, прапаноўваючы яго ўдзельнікам за сталом перагавораў вырашыць усе спрэчныя пытанні:

— Гэта было і ў 2014, і ў 2015, і ў 2022 гадах. Ды і сёння застаецца ў сіле прапанова ўсім зацікаўленым палітычным сілам вярнуцца ў Мінск для аднаўлення дыскусіі, што называецца, «па сутнасці справы». Але па прычынах, цяпер добра вядомых, ваенна-палітычны авантурызм узяў у Кіеве верх над здаровым розумам і пры падбухторванні лідараў асобных заходнееўрапейскіх краін украінскія перагаворшчыкі катэгарычна адмовіліся ад правядзення перагавораў з расіянамі на беларускай тэрыторыі, а затым ужо ў Турцыі не падпісалі і Стамбульскія пагадненні, якія давалі хоць нейкую надзею на мір.

У выніку, нагадвае эксперт, рэальнае развіццё ваенных падзей і далейшы курс на супрацьстаянне з Расіяй прывялі Украіну да значных тэрытарыяльных страт, разбурэння эканамічнай і сацыяльнай інфраструктуры і, самае галоўнае, гібелі сотняў тысяч ваенных і грамадзянскіх асоб.

— Факт застаецца фактам — вайна нанесла велізарныя страты эканомікам усіх уцягнутых у яе краін. Мільёны бежанцаў пазапаўнялі краіны «калектыўнага Захаду», узаемныя санкцыі і эканамічныя абмежаванні, гонка ўзбраенняў, палітычная турбулентнасць у Амерыцы і Еўропе — усё гэта і многае іншае з'яўляецца следствам вайны на паўднёвым усходзе Украіны, — канстатуе намеснік старшыні профільнай камісіі Палаты прадстаўнікоў.

Разам з тым развязка канфлікту магчымая пры садзейнічанні «моцных гэтага свету». У 2025 годзе ў верхнія эшалоны палітычнай улады ЗША прыйшлі людзі, якія значна больш цвяроза ацэньваюць становішча спраў у галіне міжнародных адносін.

— У палітычных колах, дзе дамінуюць рэспубліканцы або іх прыхільнікі, атрымалі распаўсюджванне настроі здаровага прагматызму, у тым ліку і ў пытаннях мірнага ўрэгулявання расійска-ўкраінскага ўзброенага канфлікту. Гэта добра разумеюць непрадузятыя амерыканскія і еўрапейскія палітычныя эксперты і аналітыкі, — звяртае ўвагу суразмоўца.

— Ацэньваючы сітуацыю ва Усходняй Еўропе, Прэзідэнт Злучаных Штатаў у сваіх публічных выступах пастаянна падкрэслівае, што яго відавочна не задавальняе далейшы працяг вайны і ён мае намер садзейнічаць усталяванню перамір'я паміж Украінай і Расіяй з наступным заключэннем мірнага дагавора на кампрамісных для абедзвюх краін умовах. Зразумела, што Трамп уяўляе сябе вялікім архітэктарам мірных здзелак і ў яго сапраўды маецца пэўны вопыт у такіх справах.

Парламентарый нагадаў, у актыве рэспубліканца — нядаўняя паспяховая медыяцыя ў канфлікце паміж Азербайджанам і Арменіяй на Паўднёвым Каўказе, а яшчэ раней — паміж Індыяй і Пакістанам у Кашміры, паміж Ізраілем і арабскімі дзяржавамі на Блізкім Усходзе.

Рыхтуй сані — летам... Прымаўка, справядлівая не толькі ў дачыненні да руплівай працы па гаспадарцы ці на зямлі, а цяпер і да ўстаноў культуры, у якіх лета — традыцыйна «мёртвы сезон». Асабліва ў тэатраў, якія закрываюцца на адпачынак. Дык вось, усё мяняецца, і нават гэтая традыцыя. Бо за апошнія некалькі гадоў асобныя тэатры краіны прыйшлі да высновы, што новы сезон трэба пачынаць раней, не ў верасні, а яшчэ ў жніўні. І на гэтым набіраюць ачкі на свой рахунак, а можа і грошы, што цяпер асабліва актуальна для тэатральна-відовішчных арганізацый. Няма калі раскачвацца, трэба зарабляць. А гледачам ад гэтага толькі задавальненне.



### ЖНІВЕНЬСКАЕ

Бо насамрэч у людзей, якія паспелі адпачыць раней, альбо ў турыстаў, якія «завіслі» ў сталіцы Беларусі летам, ёсць магчымасць правесці вольны час ці вечар выхаднога дня ў тэатры. Вядома, з адпаведным рэпертуарам, які дазваляе крыху разняволіцца. Некаторыя папярэдні сезон скончылі пазней ці працягнулі гастрольнай часткай, як Вялікі тэатр. А некаторыя — не марудзяць з пачаткам новага. Першы, хто забаўляе ўжо напачатку жніўня, — Беларускі дзяржаўны маладзёжны тэатр, які парадаваў прэм'ерамі (пластычным спектаклем «Крохкасць» і меладрамай «Старэйшы сын» паводле Аляксандра Вампілава ў пастаноўцы Таццяны Аксёнкінай).

У сярэдзіне жніўня Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Максіма Горкага новы сезон адкрыў спектаклем «Утаймаванне свавольніцы» паводле Шэкспіра ў пастаноўцы Валянціны Еранькоўай.

А бліжэй да канца жніўня іншыя пакрысе падцягваюцца — калі адчуваецца подых восені і трэба настроіцца на сур'ёзны (працоўны) лад. І тут падключыўся Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі, які для адкрыцця сезона абраў прэм'ерную пастаноўку «Памінальная малітва» паводле Рыгора Горына, абвясціўшы такім чынам пачатак «сезона сэнсаў» на сваёй сцэне — ну, паглядзім, падумаем...

А пакуль мы знаходзімся на тым цудоўным моманце, калі яшчэ можна далучыцца да святкавання пачатку тэатральнага сезона: першыя паказы пасля перапынку звычайна адбываюцца вельмі эмацыйна і натхнёна, бо кожны артыст імкнецца выкласціся альбо заявіць пра сябе, асабліва цікава, калі на сцэне моладзь. І, як ні дзіўна, гэта можа быць адна з найстарэйшых сцэн Беларусі...

На гэтым тыдні сапраўдным тэатралам прадставяць неўміручую «Паўлінку» паводле Купалы ў пастаноўцы Льва Літвінава. Гэта легендарны спектакль 1944-га года, упершыню паказаны ў Томску, дзе ў эвакуацыі знаходзіўся тэатр — у той жа год яму надалі імя Янкі Купалы. І шмат гадоў тут без варыянтаў: адкрыццё сезона — значыць «Паўлінка». Былі спробы зрабіць яе іншай, але адбылося вяртанне таго самага варыянта Літвінава. Толькі цікава, хто і як увасабляе каларытных герояў Купалы цяпер?.. Адказ на пытанне ахвотныя знойдуць 27 жніўня.




### ВЕРАСНЁЎСКАЕ

Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Беларусі сёлета пра спектакль адкрыцця сезона абвясціў яшчэ... падчас закрыцця papярэдняга. Гэта зразумела: атрымаўшы ў рэпертуары гучную прэм'еру — оперу «Арлеанская дзева» Пятра Чайкоўскага — хочацца зрабіць акцэнт на ёй. І гэта насамрэч абгрунтавана, бо спектакль мала таго, што новы, але і небанальны, таму што імкнецца ўцягнуць сучаснага гледача ў падзеі далёкага мінулага і дэманструе: опера — гэта адметны від мастацтва, які даступны кожнаму чалавеку, бо здольны глыбока кранууць. Рэжысёр-пастаноўшчык Георгій Ісаакян дасягнуў мэты, паставіўшы надзвычай складаную задачу трупе і асабліва выканаўцы галоўнай партыі Жанны-Іааны. Дык вось, на адкрыцці — 4 верасня — яе будзе спяваць прызнаная зорка айчыннай оперы Аксана Волкава. А ўжо на наступным паказе аматары оперы могуць паслухаць маладую спявачку Дар'ю Гаражанку, якая ўразіла падчас першага паказу. Як па мне, дык варта было б схадзіць на абодва паказы — бо гэта будуць розныя спектаклі!.. А балетная трупа Вялікага пачынае 7 верасня прэм'ерай трох аднаактовых спектакляў пад агульнай назвай «Скокі» ў пастаноўцы Ігара Колба, які з'яўляецца галоўным харэографам тэатра і звычайна «падкідвае» праз свае працы эмоцый у топку тэатральных жарсцяў.

Балетаманам зноў будзе пра што паразмаўляць і паспрачацца, асабліва ў кантэксце таго, што іншая балетная трупа — Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра — запланавала на адрыццё сезона 9 верасня прэм'еру «Купалле» харэографа Сяргея Мікеля (напачатку восені крыху ўспамінаў пра плённае лета).

### ПАЗАЧАСОВАЕ

А некаторыя тэатры жывуць нібыта па-за часам і напачатку новага сезона адразу прапануюць не толькі наталяцца мастацтвам, але і адразу сур'ёзна думаць. Гэта характэрна заўсёды (і без дадатковых абвяшчэнняў) для Беларускага дзяржаўнага тэатра лялек. 13 верасня ён пачне ранішнія спектаклі для дзяцей казкай «За снежнай каралевай», а 18-га вечарам дарослых ахіне інтэлектуальнае «Мроіва» (абедзве пастаноўкі Яўгена Карнягі).

Ну, і сезонна-святочнае сёлета шукаем у Беларускім дзяржаўным акадэмічным тэатры юнага гледача. 17 верасня ТЮГ будзе святкаваць 70-гадовы юбілей. Афіцыйна адкрыўшыся 7 верасня драматычным «Макбетам» паводле Шэкспіра ў пастаноўцы Таццяны Самбук, з 11 верасня тэатр абвяшчае цэлы тыдзень урачыстасцяў і адмысловай праграмы. Нішто сабе пачатак 70-га тэатральнага сезона! Кажуць, як пачнеш год, так і правядзеш... Добра, каб так і было — з натхненнем. Бо чалавеку патрэбна нешта для сэрца і розуму — а ён у тэатры так ці інакш атрымлівае пэўны творчы імпульс, з якім праца ў любой сферы і жыццё наогул становяцца больш асэнсаванымі.

**Ларыса ЦІМОШЫК**


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**ОАО «Н Холдинг»**
***проводит повторный открытый аукцион по продаже недвижимого имущества***

**Аукцион проводится в соответствии с действующим законодательством и Положением ОАО «Н Холдинг» по организации и проведению аукционов по продаже капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **ЛОТ № 1** | Капитальное строение с инв. № 500/С-24792, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, д. 41. Площадь – 5415,7 кв. м. Наименование – Здание специализированное физкультурно-оздоровительного и спортивного назначения. Назначение – Здание специализированное физкультурно-оздоровительного и спортивного назначения. Объект недвижимости обременен арендой. Капитальное строение расположено на земельном участке с кадастровым номером 500000000007001069 площадью 3,5098 га, предоставленном продавцу на праве постоянного пользования (срок действия: не установлен). На земельном участке установлены следующие ограничения: охранная зона канализации, площадь 0,1551 га | | | | |
| **Начальная цена (стоимость) (в т. ч. НДС 20 %), BYN** | **6 959 917,44** | **Задаток, BYN** | **695 991,74** | **Шаг аукциона** | **5 %** |
| **Сведения о продавце/ организаторе аукциона, его местонахождение и контактные телефоны** | ОАО «Н Холдинг» 220029, г. Минск, пр-т Машерова, 11, пом. 1. тел. 8 029 133 03 33, Елена, e-mail: arenda@h-holding.by | | | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | Договор купли-продажи должен быть заключен в течение **10 (десяти) рабочих дней** со дня утверждения протокола о результатах аукциона | | | | |
| **Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона** | Победитель аукциона или единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, в течение **5 (пяти) календарных дней** со дня утверждения протокола о результатах аукциона обязан возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение на основании счета, выставленного организатором аукциона | | | | |
| **Условия оплаты** | Оплата задатка производится резидентами в белорусских рублях (нерезидентами в белорусских рублях или в долларах США по курсу НБ РБ на дату оплаты) на следующие банковские реквизиты: р/с BY79 AKBB 3012 0000 1634 1000 0000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код AKBBBY2X, 220005, г. Минск, пр-т Независимости, 56. Получатель – Открытое акционерное общество «Н Холдинг», УНН 101059240, ОКПО 37392696. Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты объекта, оплата стоимости имущества должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона | | | | |
| **Место, дата и время приема заявлений на участие в аукционе** | Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по **24 сентября 2025 включительно** в рабочие дни с 9.00 до 16.55 по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, д. 35-1 | | | | |
| **Место, дата и время проведения аукциона** | Аукцион состоится **25 сентября 2025 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, 35-1, зал совещаний ОАО «Н Холдинг» | | | | |
| Организатор аукциона после опубликования извещения о его проведении вправе в любое время без объяснения причин, но не позднее чем за 3 календарных дня до даты проведения аукциона, указанной в извещении о проведении аукциона, отказаться от проведения аукциона | | | | | |

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ по продаже движимого имущества**

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении электронных торгов **№ 2025.Г.002.00206** по продаже имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by.

**Продавец:** Транспортное республиканское унитарное предприятие «Минское отделение Белорусской железной дороги», г. Орша, ул. Константина Заслонова, 3, тел. 80216503733.

**Организатор, Оператор электронной торговой площадки ETPVIT.BY**: коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, https://etpvit.by.

**Дата и время проведения торгов: 26.09.2025 в 9.00** (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

**Лот № 1.** Грузовая специальная цистерна (топливозаправщик) КАМАЗ 5320,

регистрационный знак ВА9959, 1990 года выпуска, тип ТС – грузовой специальный цистерна, кузов (рама) 362265, цвет – темно-зеленый, объем двигателя 10,850 л., дизельное топливо, инвентарный № 0508087, пробег – 500000 км.

**Местонахождение имущества:** Витебская область, г. Орша, ул. Константина Заслонова, 3.

**Начальная цена**: 13080,00 бел. руб. без НДС.

**Задаток:** 1308,00 бел. руб.

**Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами:** до 16.00 25.09.2025.

Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочие дни с 09.00 до 16.00 по предварительному согласованию с Продавцом по тел. +375 (29) 2973836 – Потемкин Александр Владимирович.

С подробной информацией о предмете торгов, порядке участия и оформления документов для участия в электронных торгах можно ознакомиться на сайте ЭТП ETPVIT.BY, по электронному адресу: https://etpvit.by, в разделе: транспорт.

Извещения о проведении электронных торгов опубликованы на официальных сайтах Государственного комитета по имуществу https://au.nca.by/(№32751), Витебского областного исполнительного комитета: https://vitebsk-region.gov.by.

УНП 390477566

# «ПАСТКА» НА ПАКУПНІКА

**Сабралі для вас хітрыкі прадаўцоў, якія прымушаюць купляць больш**

Вы прыйшлі ў гіпермаркет па хлеб і нават кошык браць не сталі. Але прыхапілі яшчэ некалькі тавараў «па акцыі» — і вось вам ужо не хапае рук. Вы вяртаецеся да касы па кошык... і ў выніку сума ў чэку аказваецца значна большай за тую, якую вы збіраліся выдаткаваць першапачаткова.

Або, напрыклад, хочаце набыць белую футболку. А ў выніку купілі да яе яшчэ і спадніцу, і набор упрыгожванняў (хоць зусім не планавалі). Або вырашылі набыць тэлефон, але заплацілі яшчэ і за кучу аксесуараў да яго. Калі сітуацыя вам знаёмая — а, хутчэй за ўсё, гэта так — вы... не вінаватыя. Проста вы (як і многія) сталі ахвярай псіхалагічных «пастак», якія расстаўляюць на пакупнікоў маркетолагі.

## НАВУКОВЫ ПАДЫХОД ДА КАШАЛЬКА

Маркетынг — гэта навука. Як і ў кожнай навуковай сферы, тут ёсць свае геніі і свае адкрыцці. Так, гуру продажаў Пако Андэрхіл, якога называюць «Шэрлакам Холмсам свету гандлю», прысвяціў кнігу «Чаму мы купляем» інтэлектуальнаму супрацьстаянню паміж спецыялістамі па маркетынгу і ўсё больш кампетэнтнымі сучаснымі пакупнікамі. У гэтай барацьбе маркетолагі зыходзяць з таго, што на самай справе чалавек купляе не тавар, а шчасце і станоўчыя эмоцыі. А таксама з таго, што ўсякаму набыццю папярэднічае прыняцце рашэння.

Наш мозг нейрафізіёлагі дзеляць на тры «падраздзяленні». Гэта, уласна, «чалавечы мозг» — у яго падпарадкаванні логіка і ўсвядомленае жыццё. «Мозг млекакормячага» адказвае за эмоцыі (да яго звяртаюцца стваральнікі меладрам), а «рэптыльны мозг» у адказе за фізічнае выжыванне канкрэтнай асобіны. І менавіта да гэтай часткі нашага мозгу апелююць асноўныя «пасткі» маркетынгу. Напрыклад, «большасць гаспадынь выбіраюць гэты сродак для мыцця» або «78 % жанчын пацвердзілі эфектыўнасць гэтага крэму ад маршчын». Калі тысячы людзей пацвердзілі бяспеку і эфектыўнасць дадзенай прадукцыі, значыць, гэта добрая рэч, пераконвае нас «рэптыльны мозг». Ён жа прымушае чытаць водгукі аб таварах і паслугах у інтэрнэце і робіць нас залежнымі ад чужога меркавання.

Гармон дафамін адказвае за задавальненне ад ежы або ўзнагароды. Нам прыемна, калі нас хваляць: гэта ўсё дафамін. Мы чакаем свята: гэта таксама ён. Той жа механізм падахвочвае нас працаваць у надзеі, што значныя для нас людзі ацэняць вынік. І ён жа прымушае нас купляць «таннейшы тавар» па акцыі. І ўплывае на пакупкі пад уздзеяннем «пачуцця ўзаемнасці»: добразычлівыя кансультанты ў гандлёвай зале выклікаюць падсвядомае жаданне набыць тавар.

## АБ КАГНІТЫЎНЫХ СКАЖЭННЯХ

Гэтым тэрмінам псіхолагі называюць падрыхтаваныя загадзя памылкі мыслення, на якіх будуюцца «пасткі» на пакупніка. Напрыклад, у чалавечай псіхалогіі закладзена нелюбоў да страт. Тавары з бясплатным перыядам тэставання — пра гэта. Як правіла, гэта дарагія тавары не першай неабходнасці. Скажам, робаты-пыласосы: без такога цуду тэхнікі можна абысціся, але ж ён ужо ў цябе дома, фактычна твой — як аддаць назад? Або дамашнія трэнажоры. Качаць прэс можна проста на падлозе, а бегаць у парку, але ж на трэнажоры весялей і цікавей — пакуль не надакучыць. З гэтай жа серыі дэгустацыі ў гіпермаркетах або прымерачныя з выгадным асвятленнем і люстэркамі, што робяць нас больш стройнымі і выклікаюць жаданне зрабіць сэлфі. А калі вы ўжо выклалі сваё фота ў абноўцы ў сацсетках, няхай нелагічна не купіць яе.

І, вядома, гэта акцыі накшталт «дамашні інтэрнэт першы месяц бясплатна, тарыф мабільнай сувязі першыя некалькі месяцаў за палову кошту, адукацыйныя курсы з бясплатнымі пробнымі ўрокамі».



Або такое кагнітыўнае скажэнне, як імкненне не прапусціць выгаду. Акцыі і зніжкі, тры тавары па цане аднаго, тавар у падарунак — гэтыя прыёмы старыя як свет, але яны працуюць. Пра гэта ж — ілюзія абмежаванага часу, калі трэба паспець да канца распродажу (напрыклад, таймер на маркетплэйсах: аформіце куплю за 20 хвілін і атрымаеце зніжку), пра гэта ж — абмежаваныя серыі тавару ў інтэрнэт-гандлі («засталося 2 адзінкі»). Стварэнне штучнага попыту ў гіпермаркетах, калі з шэрагу на паліцы прыбіраецца частка тавару, каб узнікала ілюзія, што яго «разбіраюць». З аднаго боку, вы адчуваеце сябе разумным і спрытным — паспелі купіць тавар па акцыі і сэканомілі грошы. З другога — у вас няма часу абдумаць, а ці патрэбны вам гэты тавар у прынцыпе.

Правіла трох «так» вядома кожнаму маркетолагу. Калі пакупнік паклаў у кошык два тавары, верагоднасць, што ён возьме і трэці (які яму на самай справе не патрэбны) павялічваецца на 80 %. Таму бессэнсоўныя, але мілыя дробязі, а таксама салодкія прысмакі размяшчаюць каля касы — гэта заўсёды самая дарагая зона ў краме, і сюды чалавек прыходзіць ужо з поўным кошыкам. Ну а найбольш танныя тавары — на самых ніжніх паліцах, каб пакупнік «глядзеў на іх зверху ўніз то-бок пагардліва». Практычна тое ж самае, але даражэйшае, будзе размяшчацца на ўзроўні вачэй сярэднестатыстычнага чалавека.

## КОЛЕР, ВОДАР, ГУК

Заўважылі, што цэннікі на зніжкі звычайна жоўтага і аранжавага колераў? У прыродзе гэты колер прыцягвае ўвагу (акцыі не застануцца незаўважанымі). Чорны асацыіруецца з рэспектабельнасцю, зялёны — колер дазволу: зялёную кнопку «Дадаць у кошык» часцей націскаюць. Чырвоны і ружовы колеры ўпакоўкі або цэнніка працуюць на прыгожую палову: павышаюць продажы «жаночага тавару» на 10—15 %.

Любая купля — гэта рашэнне, якое можна прымаць на аснове логікі, а можна — імпульсіўна. Маркетолагі імкнуцца дасягнуць максімальнай долі эмоцый у нашым рашэнні аб набыцці. Пахі свежаскошаных лугавых траў і ігліцы, сандала і ружы супакойваюць, у дзіцячых аддзелах выкарыстоўваюцца водары садавіны. Пахі ванілі і карыцы абуджаюць апетыт (ідэальна для прадуктовых «гіпераў»), а ледзь улоўны водар малочных дэсертаў робіць нас больш даверлівымі. І мы лягчэй расстаёмся «са сваімі кроўнымі».

І, нарэшце, музыка. Падлічана, што да імпульсіўных пакупак падштурхоўвае музычны фон парадку 60 тактаў у хвіліну. У крамах, дзе цэны апрыёры нізкія, выкарыстоўваюць энергічную музыку, каля 90—110 тактаў у хвіліну: пакупнікі хутчэй рухаюцца ўздоўж гандлёвых шэрагаў і хутчэй прымаюць рашэнні.

Тое, што мы гэта ведаем, не адмяняе псіхалагічнага ўздзеяння на нас гэтых прыёмаў. Але, прынамсі, мы можам іх адсачыць. І, магчыма, сэканоміць грошы, не накупіўшы таго, што рызыкуе трапіць у смецце неўзабаве пасля пакупкі.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ по продаже земельных участков в частную собственность

**Организатор электронных торгов: Голоцкий сельский исполнительный комитет, Минская область, Пуховичский район, аг. Голоцк, ул. Центральная, 11, тел.: (801713)68589, 68636, 68799.**
**Оператор электронной торговой площадки:** открытое акционерное общество «Белорусская универсальная товарная биржа»
**Электронный адрес электронной торговой площадки:** www.et.butb.by. **Дата проведения электронных торгов: 29 сентября 2025 г.**
**Время проведения электронных торгов устанавливается**
ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа» на электронной торговой площадке «БУТБ-Имущество»

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер; целевое назначение земельного участка; вид права | Площадь земельного участка, *га* | Инженерная инфраструктура (возможность подключения) | Начальная цена, *руб.* | Задаток, *руб.* | Расходы по подготовке, *руб.* |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Минская область, Пуховичский р-н, д. Моторово, ул. Молодёжная, 58А | 624482503101000550, строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома; частная собственность | 0,0976 | Сети электроснабжения, газоснабжения, водоснабжение | **24 009,60** | **2 400,96** | **3 357,93** |

**Задаток для участия в электронных торгах перечисляется** на расчетный счет № BY60AKBB 30120000066940000000 в ОАО АСБ «Беларусбанк» г. Минск код банка AKBBBY2X, УНП 190542056, получатель платежа – ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа».

**Срок внесения задатка –** до подачи заявления на участие в электронных торгах. **Назначение платежа:** внесение суммы задатка на участие в торгах.

**Окончание приема заявлений на участие в электронных торгах** с прилагаемыми к ним документами – **24 сентября 2025 г. до 15.00**

Лицо, желающее принять участие в электронных торгах, в отношении нескольких предметов электронных торгов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из этих предметов торгов.

Оплата стоимости предметов торгов осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли.

Осмотр земельных участков на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время либо с участием представителя организатора в рабочее время (понедельник–пятница, 8.30–13.00, 14.00–17.30).

Электронные торги проводятся в порядке, установленном Положением о порядке проведения электронных торгов по продаже государственного имущества, включая земельные участки, права заключения договора аренды государственного имущества, в том числе земельных участков, в частную собственность, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 608 и Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа» от 29.12.2015 № 143.

В течение десяти рабочих дней после утверждения протокола победитель электронных торгов (претендент на покупку) обязан:

возместить расходы по подготовке, в том числе связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении этого земельного участка;

выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка;

внести плату за земельный участок, продаваемый в частную собственность.

После совершения победителем электронных торгов (претендентом на покупку) указанных действий, но не позднее двух рабочих дней, исполнительный комитет передает ему выписку из решения об изъятии земельного участка и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона и один экземпляр протокола.

Затраты на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к земельным участкам для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов подлежат возмещению в порядке, предусмотренном в соответствии с ПОСТАНОВЛЕНИЕМ Совета Министров Республики Беларусь 1 апреля 2014 г. № 298 «Об утверждении положения о порядке возмещения лицом, которому предоставлен земельный участок, затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к такому земельному участку».

## ИНФОРМАЦИЯ о проведении открытого аукциона по продаже не завершенного строительством незаконсервированного капитального строения, переданного в собственность Каменского сельсовета Лепельского района Витебской области

Организатор: Каменский сельский исполнительный комитет

| Лот | Адрес расположения объекта и земельного участка, размеры | Место, дата, время начала и окончания приема заявлений об участии в аукционе и прилагаемых к ним документов | Расходы по подготовке и изготовлению документации, рублей | Начальная цена, рублей | Сумма задатка, рублей (10 %) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Витебская область, Лепельский район, **д. Макаровщинаа, ул. Алексея Ладика, д. 8А;** фундамент площадью 80 кв. м, бутобетон, земельный участок – право аренды, размер – 0,1990 га | 211189, Республика Беларусь, Витебская область, Лепельский район, аг. Камень, ул. Ленинградская, д. 25а, Каменский сельисполком, конт. тел.: (802132) 6 99 62, (802132) 6 97 54 **с 26 августа 2025 до 16.30 22 сентября 2025 года** в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 | Расходы на опубликование в средствах массовой информации, расходы за услуги по определению оценочной стоимости не завершенного строительством незаконсервированного капитального строения | **6383,12** | **638,31** |

**Аукцион состоится 26 сентября 2025 года в 15.00 по адресу:** Витебская область, Лепельский район, агрогородок Камень, улица Ленинградская, 25а.

**Последний день приема заявлений: 22 сентября 2025 года до 16.30.**

Извещение о проведении аукциона Вы можете найти:
- на сайте Витебского облисполкома;
- на сайте Лепельского райисполкома;
- на сайте Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь.

Контактные телефоны: **8 02132 6-99-62, 6-97-54.**

УНП 300039758

ЗЯЛЁНАЯ АПТЭКА

# «СПАКОЙ, КАЛІ ЗДАРОВА ЦЕЛА...»

## Травяны збор можа дапамагчы вярнуць душэўную гармонію, калі ведаць, як яго гатаваць і ўжываць

Так напісаў у адным з вершаў Цярэнцій Траўнік, паэт і філосаф з такім гучным прозвішчам. І гэта дакладна на ўсе 100 %. Душэўная раўнавага — гэта шчасце. Нельга бясконца жыць у трывозе, суме, няўдачах і застацца здаровым. Дэпрэсію ж лягчэй папярэдзіць, чым лячыць. Травы роднай прыроды — вам у дапамогу!

Піць заспакаяльныя настоі, адвары, настойкі і гарбату звычайна рэкамендуюць увечары. Калі, вядома ж, урач не параіць павялічыць кратнасць прыёмаў. У карыснае зелле часта ўваходзяць святаяннік, скрыпень, лісце маліны, мята перцавая, рамонак, меліса, першацвет, лісце вішні і многія іншыя лекавыя расліны, якія нясуць нашай душы супакаенне, а часам і задавальненне.

Абавязкова абмяркуйце з урачом вашы планы па прыёме збораў з лекавых траў, якія аказваюць заспакаяльны эфект.

**Алена РАМАНАВА.**



Здрабніце сушаную сыравіну: па 4 г травы мацярдушкі звычайнай, сардэчніку і чабору паўзучага, 2 г карэнішча з каранямі валяр'яну лекавага, 1 г травы баркуну. Заліце сумесь у шкляной або эмаліраванай пасудзіне 3 шклянкамі кіпеню, шчыльна накрыйце і пачакайце чвэрць гадзіны. Настой працадзіце і адцісніце, давядзіце яго аб'ём да 600 мл гатаванай вадой. Ужывайце, папярэдне ўзбоўтаўшы, у цёплым стане па 1/3 шклянкі чатыры разы на дзень за паўгадзіны да яды. Курс лячэння — 10—14 дзён, перапынкі складаюць 10 сутак.

Супрацьпаказанні: акрамя павышанай адчувальнасці да кампанентаў збору, цяжарнасць, груднoе кармленне, узрост да 12 гадоў. Пры працяглым ужыванні настою верагодна ўзнікненне зніжэння хуткасці псіхаматорных рэакцый. Таму захоўвайце асцярожнасць падчас працы, якая патрабуе павышанай канцэнтрацыі ўвагі і хуткасці рэакцый, напрыклад, падчас кіравання аўтатранспартам.

Здрабніце сушаную сыравіну: па 3 г кветак рамонку і нагаток, парасткаў багуну балотнага і травы фіялкі, 2 г каранёў лакрычніку, 1 г лісця мяты перцавай. Заліце шклянкай кіпеню. Настой гатовы да ўжывання праз чвэрць гадзіны, працадзіце яго і адцісніце. Піце па паўшклянкі 2-3 разы на дзень.

Здрабніце сушаную сыравіну: 6 г пладоў шыпшыны майскай, па 10 г шышак хмелю звычайнага і травы з кветкамі святаянніку прадзіраўленага, 6 г травы мацярдушкі звычайнай, 3 г травы чабору. Заліце 2 шклянкамі кіпеню на 10—15 хвілін. Піце ў гарачым стане па паўшклянкі 2-3 разы на дзень падчас прыёму ежы. Курс — 2 тыдні, яго можна паўтарыць праз 1-2 месяцы.

Настой паказаны толькі дарослым, прычым яго нельга сумяшчаць з іншымі лекавымі сродкамі. Сумесь аказвае заспакаяльны і агульнаўмацавальны эфекты, дапамагае пры бяссонніцы, пазітыўна ўплывае на сардэчна-сасудзістую і нервовую сістэмы. Супрацьпаказанні такія ж, як і ў вышэй названага рэцэпта.

Здрабніце сушаную сыравіну: па 4 г травы сардэчніку, мацярдушкі і чабору, 3 г карэнішчаў з каранямі валяр'яну, па 2 г травы баркуну і лісця вішні. Заліце сумесь шклянкай кіпеню на чвэрць гадзіны. Прымайце духмяны настой па паўшклянкі 3 разы на дзень.

Заліце 2 шклянкамі кіпеню сумесь са здробненай сушанай сыравіны: па 1 ч. л. лісця мяты і маліны, травы з кветкамі святаянніку прадзіраўленага. Настой можна ўжываць праз 20 хвілін — па шклянцы 2-3 разы на дзень з мёдам.


## ООО «Деловая оценка» (организатор аукциона) по поручению Хойникское РайПО (продавец) извещает о проведении 9 сентября 2025 года повторного открытого аукциона по продаже имущества в 12.00 по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2

**Лот № 1:** Капитальное строение с инв. № 343/С-96031, назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – здание магазина «Комфорт», общей площадью 192,4 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 325450100001017994 по адресу: Гомельская обл., Хойникский р-н, г. Хойники, ул. Тургенева, 2А. Заключен договор аренды № 39 от 10.07.2019 г. Капитальное строение с инв. № 343/С-96371, назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – Здание магазина № 42 (составные части и принадлежности – подвал), общей площадью 765,6 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 325400000010000436 по адресу: Гомельская обл., Хойникский р-н, Судковский с/с, аг. Судково, ул. Карася В.Г., 7А

Лот включает оборудование в количестве 12 ед.
Перечень имущества опубликован на сайте **www.deloocenka.by**

**Начальная цена** продажи с НДС – 102 720,00 бел. руб.
**Задаток** – 1 027,20 бел. руб.

**Лот № 3:** Капитальное строение с инв. № 343/С-96351, назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – здание магазина № 30 (составные части и принадлежности: две холодные пристройки, сарай, уборная, покрытие), общей площадью 81,3 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 325450100001018013 по адресу: Гомельская обл., Хойникский р-н, г. Хойники, ул. Советская, 172. Капитальное строение с инв. № 343/С-96350 площадью 334,1 кв. м (здание магазина № 35, назначение – здание специализированное розничной торговли, составные части и принадлежности: склад, три ограждения, покрытие, клумба), расположенное на земельном участке с кадастровым номером 325450100001018014 по адресу: Гомельская обл., Хойникский р-н, г. Хойники, ул. Советская, 127

Лот включает оборудование в количестве 8 ед.
Перечень имущества опубликован на сайте **www.deloocenka.by**

**Начальная цена** продажи с НДС – 119 940,00 бел. руб.
**Задаток** – 1 199,40 бел. руб.

**Лот № 4:** Капитальное строение с инв. № 343/С-96349, назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – здание магазина № 15 (составные части и принадлежности: сарай, уборная, ворота, ограждение), общей площадью 140,6 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 325450100001018022 по адресу: Гомельская обл., Хойникский р-н, г. Хойники, ул. Пролетарская, 52. Заключен договор аренды № 10 от 18.11.2020 г.

**Начальная цена** продажи с НДС – 55 200,00 бел. руб.
**Задаток** – 552,00 бел. руб.

**Лот № 5:** Капитальное строение с инв. № 343/С-54884, назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – здание магазина «Удобный» (составные части и принадлежности: склад, двое ворот, ограждение), общей площадью 113,4 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 325450100001016346 по адресу: Гомельская обл., Хойникский р-н, г. Хойники, ул. Карла Маркса, 45. Заключен договор аренды № 2 от 08.01.2019 г. Капитальное строение с инв. № 343/С-96373, назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – Здание магазина № 21 (составные части и принадлежности – пристройка холодная), общей площадью 304,4 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 325484812601000052 по адресу: Гомельская обл., Хойникский р-н, Стреличевский с/с, аг. Стреличево, ул. Советская, 62. Заключен договор аренды

Лот включает оборудование в количестве 11 ед.
Перечень имущества опубликован на сайте **www.deloocenka.by**

**Начальная цена** продажи с НДС – 70 800,00 бел. руб. **Задаток** – 708,00 бел. руб.

**Лот № 6:** Капитальное строение с инв. № 343/С-96370, назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – трансформаторная подстанция, общей площадью 40,9 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 325450100001018171 по адресу: Гомельская обл., Хойникский р-н, г. Хойники, ул. Советская, 79А

Лот включает оборудование в количестве 91 ед.
Перечень имущества опубликован на сайте **www.deloocenka.by**

**Начальная цена** продажи с НДС – 28 320,00 бел. руб. **Задаток** – 283,20 бел. руб.

**Лот № 7:** Капитальное строение с инв. № 343/С-45165 площадью 255,0 кв. м (здание склада, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, составные части и принадлежности: два навеса), расположенное на земельном участке с кадастровым номером 325450100001017995 по адресу: Гомельская обл., Хойникский р-н, г. Хойники, ул. Жукова, 3Е. Капитальное строение с инв. № 343/С-96074 площадью 42,4 кв. м (трансформаторная подстанция, назначение – сооружение специализированное энергетики, составные части и принадлежности: трансформаторная подстанция), расположенное на земельном участке с кадастровым номером 325450100001017997 по адресу: Гомельская обл., Хойникский р-н, г. Хойники, ул. Жукова, 3Г. Капитальное строение с инв. № 343/С-45164 площадью 23,2 кв. м (здание дизельной электростанции, назначение – здание специализированное энергетики), расположенное на земельном участке с кадастровым номером 325450100001017996 по адресу: Гомельская обл., Хойникский р-н, г. Хойники, ул. Жукова, 3Д

Лот включает оборудование в количестве 290 ед., площадка для трансформатора – 2 ед. Перечень имущества опубликован на сайте **www.deloocenka.by**

**Начальная цена** продажи с НДС – 249 696,00 бел. руб. **Задаток** – 2 496,96 бел. руб.

Расходы по приведению в надлежащий вид всей необходимой документации, государственной регистрации договора купли-продажи и перехода права на предмет аукциона возлагаются на Победителя аукциона

**Продавец: Хойникское РайПО**, г. Хойники, ул. Жукова, 3. Конт. тел.: +375 232 34-98-92, +375 29 690-00-10.

**Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота в фиксированной сумме.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1**. Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора аукциона ООО «Деловая оценка»: р/с BY60BELB30121322650030226000 в филиале ОАО «Банк БелВЭБ», г. Гомель, пр-т Ленина, 10, БИК BELBBY2X, УНП 490870026.**

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни с **10.00 до 13.00** и с **14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения.

**Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 08.09.2025 г. в 17.00.**

Порядок участия и проведения аукциона с перечнем необходимых документов опубликован на сайте www.deloocenka.by.

**Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения.** Единственный участник имеет право приобрести лот с шагом 5 %. Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; стоимость, сформированная в результате аукциона, должна быть выплачена продавцу в течение **30 (тридцати) календарных дней** с момента проведения торгов. Возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет окончательной стоимости предмета оценки. Указанные объекты никому другому не проданы, не заложены, под запретом не состоят, судебного спора о них не имеется, других владельцев нет. Проводится аукцион в соответствии с Положением Общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

**Конт. тел. организатора аукциона: +375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62.**

*Предыдущая публикация 07.08.2025 г. в газете «Звязда»*

СПОРТ-ТАЙМ

# УЗНАГАРОДЫ ЗА ЎПАРТАСЦЬ І МАЙСТЭРСТВА

## Пяць медалёў заваявалі беларусы на чэмпіянаце свету па веславанні на байдарках і каноэ

**Айчыннае веславанне на байдарках і каноэ планку не зніжае. Нягледзячы на ўсе выклікі і складанасці, нашы спартсмены працягваюць трымаць высокі ўзровень майстэрства і на міжнародных стартах не губляюцца. Усе ў гэтым упэўніліся на нядаўнім чэмпіянаце свету па веславанні на байдарках і каноэ, які прайшоў на мінулым тыдні ў Мілане.**




Беларускія весляры заваявалі пяць узнагарод. Чэмпіёнкай свету па веславанні на каноэ стала Вольга Клімава. Яна ўпэўнена, не пакінуўшы саперніцам шанцаў, прайшла самую доўгую дыстанцыю — 5 кіламетраў — за 26 хвілін і 20 секунд. Для Вольгі гэта ўжо трэцяе «золата» чэмпіянату свету на дадзенай дыстанцыі, раней яна перамагала на 5 кіламетрах у 2019 і 2021 гадах.

Таксама Вольга Клімава разам з Ангелінай Бардаvоўскай, Вікторыяй Несцярэнка і Лізаветай Прымак занялі другое месца на дыстанцыі 500 метраў сярод каноэ-чацвёрак. Беларускі саступілі толькі саперніцам з Венгрыі, тройку замкнулі прадстаўніцы Кітая. На гэтай жа дыстанцыі ў мужчынскім фінале каноэ-чацвёрак Ілья Верашчака, Станіслаў Савельеў, Уладзіслаў Палешка і Данііл Верашчака сталі бронзавымі прызёрамі.

Юлія Трушкіна і Іна Нядзелькіна заваявалі сярэбраныя медалі на 200-метровай дыстанцыі ў спаборніцтвах каноэ-двоек.

Не засталіся без медалёў і байдарачнікі. Дакладней, байдарачніцы. У фінале жаночых байдарак-чацвёрак на дыстанцыі 500 м нашы Маргарыта Ткачова, Уладзіслава Скрыганава, Іна Саўчук і Надзея Кушнер паказалі трэці вынік.

З паспяховым выступленнем на чэмпіянаце свету зборную па веславанні на байдарках і каноэ павіншаваў прэзідэнт Нацыянальнага алімпійскага камітэта Віктар Лукашэнка: «Пяць медалёў сусветнага форуму — заслужаная ўзнагарода за ўпартасць, зайздроснае майстэрства і штодзённую сумесную працу кожнага спартсмена і трэнера. Нашы весляры чарговы раз парадавалі балельшчыкаў у роднай Беларусі, прадэманстраваўшы свой найвышэйшы ўзровень і давёўшы, што займаюць годнае месца сярод лідараў планеты ў гэтым відзе спорту».

Беларускія весляры выступалі на чэмпіянаце свету ў Мілане 10 гадоў таму. Тады, у 2015-м, нашы спартсмены заваявалі чатыры залатыя медалі. Вынік лепшы. Аднак будзе не вельмі карэктным параўноўваць той вынік з дасягненнямі гэтага года: часы былі зусім іншыя. Дзесяць гадоў таму спартсмены спакойна трэніраваліся, набіраліся спаборніцкай практыкі на розных міжнародных стартах, выступалі на сваіх лодках і былі ўпэўнены ў тым, што ніякія палітычныя пытанні ім не перашкодзяць спакойна рабіць сваю працу. Сёння ж усё роўна наадварот. Весляры выступаюць на чэмпіянаце свету ў нейтральным статусе і на арэндных лодках, што добрага настрою ім не дадае. Але апускаць рукі і скардзіцца на абставіны яны не прывыклі. «Скажу так: добра, што ў прынцыпе ў нас ёсць лодкі. Мы загадзя звязваліся з людзьмі, якія гатовыя нам іх даць і заказвалі. Тут трэба мець уважаны падыход. У некаторых лодках не хапае па 2-3 кг, даводзіцца неяк удасканальваць іх. Аднак мы выходзім з сітуацыі. Жаданне заўсёды рухае горы. Калі чалавек перажывае за агульную справу, ён усё зробіць для асноўнага старту», — адзначаў у інтэрв'ю тэлеканалу «Беларусь 5» старшы трэнер жаночай зборнай па веславанні на байдарках Аляксандр Мызгін.

Сваім выступленнем у Мілане спартсмены словы трэнера пацвердзілі.

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота БелТА.**

НАДВОР'Е

# ЛЕТА ЯШЧЭ НЕ СКОНЧЫЛАСЯ

## Да нас ідзе цяпло з Балкан

**Трэцяя дэкада жніўня пачалася ў нас досыць некамфортным надвор'ем, калі ноччу і раніцай было дастаткова зябка. Сярэдняя тэмпература паветра ў гэты час была на некалькіх градусаў ніжэйшая за кліматычную норму. Але, як паведамілі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды, нябесная канцылярыя ў апошні тыдзень лета пачне выпраўляцца.**



Праўда, 26 і 27 жніўня будзе яшчэ не па сезоне холадна, таму, у аўторак умовы надвор'я будзе фарміраваць халодная няўстойлівая паветраная маса. Воблачна з праясненнямі. На большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Днём у асобных раёнах прагрыміць навальніцы. Вецер заходні ўмераны, удзень парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе ад 6 да 11 °С, а днём будзе вагацца ад 15 да 20 °С. Атмасферны ціск пачне слаба расці.

Не будзе горача і ў сераду. У гэтыя суткі ноччу ў многіх раёнах, а днём па ўсходзе краіны ўмовы надвор'я працягнуць вызначаць халодныя няўстойлівыя паветраныя масы. У дзённыя гадзіны заходнія і цэнтральныя раёны краіны апынуцца пад уплывам вобласці павышанага атмасфернага ціску. Воблачна з праясненнямі. Ноччу і раніцай на большай частцы тэрыторыі, днём месцамі па ўсходзе краіны чакаюцца кароткачасовыя даждж. Ноччу і раніцай месцамі слабы туман. Вецер заходніх чвэрці ўмераны, удзень месцамі парывісты. Тэмпература паветра ўначы апусціцца да 4–11 °С, а днём будзе падымацца не вышэй за 16–23 °С.

Летняе надвор'е будзе вяртацца да нас 28 жніўня. У чацвер захаваецца ўплыў вобласці павышанага атмасфернага ціску, а ў дзённыя гадзіны ў паўднёва-заходнія раёны краіны пачнуць паступаць цёплыя паветраныя масы з Балканскага паўвострава. Пераменная воблачнасць. Пераважна без ападкаў. Ноччу і раніцай месцамі слабы туман. Вецер паўднёвай чвэрці ўмераны, днём месцамі парывісты. Халодная хваля захаваецца толькі ўначы, калі тэмпература паветра будзе апускацца да 4–10 °С, месцамі да плюс 12 °С. Аднак днём ужо пацяплее — ад 18 °С па поўначы да 28 °С па паўднёвым захадзе краіны.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## Надвор'е на заўтра

| Горад | Ціск | Ноччу | Днём |
|---|---|---|---|
| МІНСК | 762 мм рт.сл. | +9..+10°С | +15..+17°С |
| ВІЦЕБСК | 761 мм рт.сл. | + 7..+9°С | +15..+17°С |
| МАГІЛЁЎ | 762 мм рт.сл. | +8..+9°С | +16..+17°С |
| ГОМЕЛЬ | 762 мм рт.сл. | +10..+11°С | +17..+19°С |
| ГРОДНА | 763 мм рт.сл. | +7..+9°С | +16..+18°С |
| БРЭСТ | 762 мм рт.сл. | +10..+12°С | +17..+18°С |

Паводле даных Белгідрамета

...у суседзяў

МАСКВА +17..+18°С
С.-ПЕЦЯРБУРГ +15..+17°С

Месяц

*Маладзік 23.08.–30.08. Месяц у сузор'і Шаляў.*

Геамагнітныя ўзрушэнні




Абазначэнні:
— няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў
— невялікія геамагнітныя ўзрушэнні
— слабая геамагнітная бура
— малая геамагнітная бура



Фота Лізаветы ГОЛАД.

## 26 ЖНІЎНЯ Даты Падзеі Людзі

У краіне

**1930** год — нарадзіўся Яўген Міхайлавіч Камароўскі (в. Савоні Стаўбцоўскага раёна Мінскай вобласці), беларускі мовазнаўца, кандыдат філалагічных навук (1965). Аўтар работ «Беларуская мова. Арфаграфія», «Беларускі правапіс», навучальных дапаможнікаў «Беларуская дыялекталогія. Хрэстаматыя», «Беларуская мова» і інш.

**1935** год — нарадзілася Святлана Міхайлаўна Клімковіч (г. Мінск), беларуская пісьменніца, драматург. Працавала на Беларускім тэлебачанні, адказным рэдактарам бюлетэня «Тэатральны Мінск», у часопісе «Пачатковая школа». Аўтар казак-п'ес «Балада аб белай вішні», «Вясновая песня», лібрэта оперы «Дзікае паляванне караля Стаха» паводле аповесці У. Караткевіча.

**1945** год — у Мінску ў адпаведнасці з пастановай Дзяржаўнага Камітэта абароны на базе аўтазборачнага завода пачата будаўніцтва Мінскага аўтамабільнага завода.

У свеце

**1728** — мараплавец Вітус Берынг адкрыў праліў паміж Азіяй і Амерыкай, які атрымаў назву Берынгаў праліў.

**1740** год — нарадзіўся Жозэф Мішэль Мангальф'е (1740—1810), французскі вынаходнік паветранага шара.

**1915** год — нарадзіўся Барыс Феакціставіч Сафонаў, легендарны савецкі марскі лётчык-паўночнаморац часоў Вялікай Айчыннай вайны, двойчы Герой Савецкага Саюза, гвардыі падпалкоўнік. У 1941—1945 гг. быў камандзірам эскадрыллі. У паветраных баях у Запаляр'і асабіста збіў 25 варожых самалётаў. Загінуў у баі пры адбіцці налёту варожай авіяцыі на караблі канвою, збіўшы два фашысцкія самалёты.

**1945** год — савецкія войскі завяршылі вызваленне Паўднёвага Сахаліна ад японскіх захопнікаў.

**Калектыў Выдавецкага дома «Звязда» выказвае шчырыя спачуванні загадчыку аддзела рэалізацыі Людміле Аляксандраўне Драздовай з прычыны напаткаўшага яе вялікага гора — смерці МУЖА.**

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 11 461. Індэкс 63850. Зак. № 1784.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 25 жніўня 2025 года.